**Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.: прадмова**

**Дзяржаўны дэпартамент ЗША**

## Прадмова

### З якой мэтай складаюцца справаздачы

Дадзены даклад прадстаўляецца Кангрэсу Дзяржаўным дэпартаментам у адпаведнасці з Раздзелам 102 (b) Закону аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе (IFRA) 1998 г. Законам прадугледжваецца, што Дзяржаўны сакратар з дапамогай Пасла па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды прадстаўляе Кангрэсу "Штогадовы даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету, які дапаўняе апошнія даклады па правах чалавека падрабязнай інфармацыяй, якая тычыцца пытанняў міжнароднай рэлігійнай свабоды". Дадзены даклад ўключае 195 справаздач па краінах розных рэгіёнаў свету.

### Якім чынам складаюцца даклады

У жніўні 1993 г. Дзяржаўны сакратар выступіў з прапановай актвывізаваць дзейнасць нашых пасольстваў па садзейнічанню развіццю правоў чалавека. Усім аддзелам пасольстваў было даручана прадстаўляць інфармацыю і доказы, якія пацвярджаюць парушэнні правоў чалавека, і былі зроблены намаганні па ўключэнню ў праграмы дзейнасці місій задач развіцця правоў чалавека і дэмакратыі. У 1994 г. Бюро па правах чалавека і гуманітарных пытаннях было рэарганізавана і перайменавана ў Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы, што з’явілася адлюстраваннем больш шырокай тэндэнцыі і больш мэтанакіраванага падыходу да ўзаемазвязаных пытанняў правоў чалавека, правоў працоўных і дэмакратыі. У 1998 г. Дзяржаўны сакратар заснаваў Аддзел міжнароднай рэлігійнай свабоды. У маі 2002 г. Джон В. Хэнфард III быў прыведзены да прысягі ў якасці другога Пасла па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды.

Даклад за 2002 г. ахоплівае перыяд з 1 ліпеня 2001 г. па 30 чэрвеня 2002 г. і адлюстроўвае настойлівыя намаганні, якія былі прыкладзены на працягу года сотнямі служачых Дзяржаўнага дэпартамента, дыпламатычных службаў і іншых дзяржаўных органаў ЗША. Нашы пасольствы, якія падрыхтавалі першапачатковыя праекты справаздач, на працягу ўсяго гэтага перыяда збіралі інфармацыю з розных крыніц, уключаючы дзяржаўных служачых і прадстаўнікоў царквы, няўрадавыя арганізацыі, журналістаў, назіральнікаў па кантролю за выкананнем правоў чалавека, рэлігійныя групы, акадэмічныя колы. Нягледзячы на тое, што такі збор інфармацыі можа прадстаўляць значную пагрозу, супрацоўнікі дыпламатычных службаў ЗША, якія працуюць у складаных і часам небяспечных умовах, рэгулярна ажыццяўляюць праверку паведамленняў аб парушэннях правоў чалавека, нагляд за правядзеннем выбараў і аказваюць дапамогу людзям, якія падвяргаюцца небяспецы з-за сваіх рэлігійных вераванняў.

Пасля таго, як пасольствы завяршылі падрыхтоўку справаздач, іх тэксты былі накіраваны ў Вашынгтон, дзе былі ўважліва разгледжаны ў Аддзеле па падрыхтоўцы справаздач па краінах і пытаннях дазвалення прыстанішча Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы, якія працавалі ў цесным узаемадзеянні з іншымі органамі Дзяржаўнага дэпартамента і аддзелам Пасла па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды, які нясе асноўную адказнасць за падрыхтоўку даклада па даручэнню Дзяржаўнага сакратара. Падчас працэсу праверкі, аналізу і рэдагавання справаздач, супрацоўнікі аддзела выкарыстоўвалі ўласныя крыніцы інфармацыі. Гэтыя крыніцы ўключалі справаздачы і паведамленні, якія былі прадстаўлены праваахоўнымі групамі ЗША і іншых краін, замежнымі дзяржаўнымі чыноўнікамі, прадстаўнікамі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і іншых міжнародных і рэгіянальных арганізацый, экспертамі адукацыйных і навукова-даследчых установ, сродкамі масавай інфармацыі. Яны таксама праводзілі кансультацыі з экспертамі па пытаннях дыскрымінацыі і праследаванняў на рэлігійнай глебе, з рэлігійнымі лідэрамі ўсіх канфесій і з экспертамі па

юрыдычных пытаннях. Пры гэтым прынцыпам, якім яны кіраваліся у сваёй дзейнасці, з'яўлялася максімальна аб"ектыўная, старанная і справядлівая ацэнка адпаведнай інфармацыі.

Даклад будзе выкарыстоўвацца ў якасці крыніцы даных для фарміравання палітыкі, у дыпламатычнай дзейнасці, пры аказанні дапамогі, правядзенні навучання і ў іншых сферах выкарыстання выдаткаваных сродкаў. У адпаведнасці з IRFA ён таксама будзе выкарыстоўвацца ў якасці асновы для прыняцця рашэнняў пры вызначэнні краін, якія ажыццяўлялі ці дапускалі "асабліва грубыя парушэнні" свабоды веравызнання. Краіны, якія дапусцілі гэтыя і іншыя парушэнні, прадугледжаныя IRFA, у дакладзе непасрэдна не называюцца, але з імі урад ЗША працаваў і будзе працаваць асобна. Дадзены даклад таксама будзе з'яўляцца асновай для супрацоўніцтва паміж урадам ЗША і прыватнымі арганізацыямі з мэтай захавання права на свабоду веравызнання, якое атрымала сусветнае прызнанне.

**Заўвагі па словаўжыванню**

У многіх выпадках у Дакладзе аб свабодзе веравызнання ў краінах свету ўказваецца, што краіна "ўвогуле выконвае" права на свабоду веравызнання. Выраз "увогуле выконвае" выкарыстоўваецца таму, што ахова і развіццё правоў чалавека прадстаўляюць сабой дынамічны працэс; нельга з упэўненасцю сцвярджаць, што любы ўрад поўнасцю і безагаворачна выконвае гэтыя правы нават у найбольш спрыяльных умовах. Адпаведна, "ўвогуле выконвае" з'яўляецца стандартным выразам, які ўжываецца для апісання тых краін, якія ў найбольш поўнай меры імкнуцца забяспечыць ахову свабоды веравызнання. Такім чынам, выраз "увогуле выконвае" характарызуе найбольш высокі ўзровень павагі да рэлігійнай свабоды, які ўстанаўліваецца дадзеным дакладам.

---

*Гэты вэбсайт належыць Бюро па грамадскіх сувязях Дзяржаўнага дэпартамента ЗША. Спасылкі на іншыя сайты сеткі Інтэрнэт не азначае падтрымку думак, што публікуюцца на іх.*

## Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.: уступ

## Уступ

Свабода веравызнання, адно з неад'емных асноўных правоў чалавека, з'яўляецца свабодай, на ахове якой доўгі час стаіць ўрад ЗША і якой даражыць амерыканскі народ. Адной з задач палітыкі, якую праводзіць урад ЗША, з'яўляецца развіццё свабоды веравызнання ва ўсім свеце і прадастаўленне яе любому чалавеку, незалежна ад яго рэлігійных вераванняў, расавай прыналежнасці, культурных каштоўнасцяў альбо нацыянальнасці. Наша палітыка накіравана на тое, каб схіліць іншыя краіны да прытрымлівання міжнародных норм у вобласці правоў чалавека і забяспечыць захаванне і развіццё фундаментальных прынцыпаў і каштоўнасцяў у ЗША. Хаця забеспячэнне выканання і развіцця свабоды веравызнання гістарычна з'яўлялася часткай нашай агульнай палітыкі ў вобласці правоў чалавека, гэтай дзейнасці ў якасці мэты знешняй палітыкі стала надавацца павышаная ўвага пасля прыняцця ў 1998 г. Закона аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе, які прадугледжвае складанне дадзенага даклада.

### Прыхільнасць ЗША свабодзе веравызнання

Існуе некалькі прычын, па якіх Злучаныя Штаты выступаюць за захаванне свабоды веравызнання. Па-першае, барацьба за свабоду веравызнання была неад'емнай часткай амерыканскай гісторыі. На раннім этапе станаўлення нашай нацыі ідэя аб тым, што кожны чалавек мае неад'емнае права спавядаць рэлігію і выконваць рэлігійныя абрады ў адпаведнасці са сваім сумленнем, стала адным з асноўных перакананняў амерыканскага народа. Свабода веравызнання знаходзіцца на першым месцы ў спісе правоў, якія вызначаны нашай канстытуцыяй, і вядома, як "першая свабода", паколькі заснавальнікі нацыі лічылі, што яна з'яўляецца асновай дэмакратыі і іншых асноўных правоў чалавека.

Дасягнуць рэалізацыі гэтай свабоды было нялёгкай справай. Сёння амерыканцы карыстаюцца свабодай веравызнання, аднак, так было не заўсёды. Наша гісторыя не ідэальная, і ў той жа час сама гэта гісторыя вымушае нас яшчэ больш рашуча абараняць тое, што было заваявана. Яна накіроўвае нас з падвоенай энергіяй дапамагаць тым мільёнам людзей за межамі нашай краіны, якія пакутуюць з-за сваёй веры. Зараз, як і ў былыя стагоддзі, многія з тых, хто найбольш аддана выступае за гэтую свабоду, з'яўляюцца новымі амерыканцамі, якія прыехалі ў краіну ў якасці бежанцаў, бо падвяргаліся на радзіме праследаванням па рэлігійных матывах.

Па-другое, свабода веравызнання з'яўляецца ўніверсальнай па свайму значэнню і ўжыванню. Яна з'яўляецца адным з "неад'емных правоў", якія вызначаны ў нашай "Дэкларацыі незалежнасці", - правам, якое не даецца ўрадамі, а з'яўляецца "правам ад нараджэння" любога чалавека любой нацыі і культуры. Гэта ісціна прызнаецца ў найбольш важным з усіх існуючых міжнародных актаў у вобласці правоў чалавека – "Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека" 1948 г., у якой адзначаецца, што "ўсе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі па сваёй годнасці і правах". Адпаведна, усе людзі маюць правы "свабоды думкі, сумлення і веравызнання".

Гэтыя фармулёўкі захоўваюць ў сабе ідэю, якая надзвычай важная для прызнання правоў чалавека, уключаючы права веравызнання. Гэта – вера ў агульную чалавечую прыроду, якая пераважае ўсе культурныя, расавыя, рэлігійныя і іншыя адрозненні. Адзначыўшы ў 1948 г. злавеснае імкненне нацызму і, у меншай ступені, каланіяльных рэжымаў, падзяліць людзей на аснове расавых і культурных адрозненняў, Члены Арганізацыі Аб'яднаных Нацый былі перапоўнены рашучасцю заявіць аб існаванні чалавечай сям'і, якая складаецца з людзей, у роўнай ступені надзеленых годнасцю і маючых роўную каштоўнасць незалежна ад іх расы, культуры, рэлігіі, прыбытку ці любога іншага адрознення.

Па-трэцяе, дзейнасць па забеспячэнні захавання свабоды веравызнання цесна звязана з намаганнямі па садзейнічанні развіццю іншых асноўных правоў чалавека і грамадзянскіх правоў і развіццём дэмакратыі. Урад, які прызнае і ахоўвае свабоду веравызнання і сумлення, разумее і прызнае неад’емную і недатыкальную годнасць чалавечай асобы. Можна лічыць, што такі ўрад будзе абараняць у адпаведнасці з нормамі заканадаўства і іншыя правы, такія, як свабода ад адвольнага арышту ці затрымання, ці свабода ад катавання і забойства.

Па ўсёй бачнасці, такі ўрад будзе таксама абараняць правы, найбольш цесна звязаныя са свабодай веравызнання, такія, як свабода слова, свабода аб'яднанняў і сходаў, а таксама права бацькоў выхоўваць дзяцей у сваёй веры. У сукупнасці гэтыя правы складаюць глебу для дэмакратычнага развіцця. Іх ажыццяўленне не толькі садзейнічае развіццю дэмакратычных інстытутаў і працэдур, такіх, як прадстаўнічае праўленне і свабодныя выбары, але таксама дапамагае ўмацаванню дэмакратычных каштоўнасцяў, уключаючы ўрад і грамадзян, якія шануюць і абараняюць годнасць асобы. Калі Злучаныя Штаты садзейнічаюць развіццю свабоды веравызнання, яны таксама дапамагаюць распаўсюджванню дэмакратыі. А больш высокі ўзровень дэмакратыі азначае большую стабільнасць і спрыяе эканамічнаму росквіту.

Урэшце, палітыка ЗША ў адносінах да свабоды веравызнання з'яўляецца сродкам барацьбы з тэрарызмам. Падзеі 11 верасня 2001 г. аказалі значны ўплыў на гэту палітыку. Напады, учыненыя Аль Каедай, паказалі, што людзі могуць карыстацца і выкарыстоўваюць рэлігію для дасягнення жудасных мэтаў, у некаторых выпадках маніпулюючы іншымі людзьмі і знішчаючы іх як простыя прылады гэтага працэсу. На жаль, гэта не новая з'ява ў гісторыі чалавечага грамадства. Некаторыя вучоныя прадказваюць, што ў свеце пасля заканчэння халоднай вайны рэлігійныя рознагалоссі могуць стаць прычынай буйных канфліктаў паміж цывілізацыямі.

Незалежна ад таго, ці збудуцца гэтыя тэорыі, падзеі 11 верасня паставілі новыя задачы перад палітыкай ЗША ў адносінах да свабоды

веравызнання. Поспех гэтай палітыкі будзе спрыяць стварэнню эфектыўнага і ўстойлівага проціяддзя не только ад праследаванняў і дыскрымінацыі на рэлігійнай глебе, але таксама ад заснаванага на рэлігійных поглядах гвалту і патэнцыяльнага "сутыкнення цывілізацый".

Прычына відавочна: там, дзе ўрады абараняюць свабоду веравызнання і грамадзяне шануюць яе як грамадскае дабро, няма месца для праследаванняў на рэлігійнай глебе і заснаванага на рэлігійных поглядах гвалту. Члены такога грамадства не толькі праяўляюць цярпімасць да рэлігійных адрозненняў, але ў сваёй большасці разглядаюць спавяданне рэлігіі як асноўную частку свабоды і годнасці асобы. Яны разумеюць, як падкрэсліваў Прэзідэнт Буш падчас выступлення як на радзіме, так і за яе межамі, што рэлігійная вера ў яе лепшых праяўленнях спрыяе фарміраванню здольных да прадукцыйнай дзейнасці і праяўлення дабрачыннасці грамадзян і фарміраванню ўстойлівага грамадства. Яны таксама разумеюць, што пазбавіць людзей права на свабоду веравызнання азначае адмовіць ім у праве праяўляць самыя запаветныя чалавечыя імкненні. У аснове свабоды ляжыць права задаваць асновапалагаючыя пытанні аб паходжанні, прыродзе, каштоўнасці і сэнсу чалавечага жыцця, а таксама спавядаць веру і жыць згодна з абавязацельствамі, якія з'яўляюцца адказам на гэтыя пытанні .

**Аддзел міжнароднай рэлігійнай свабоды**

Аддзел Пасла па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды завяршыў чацвёрты год сваёй работы. Мэтай дзейнасці Аддзела, які быў заснаваны ў 1998 г., з'ўляецца садзейнічанне захаванню і развіццю свабоды веравызнання ў краінах свету. Пасол з'яўляецца галоўным саветнікам Прэзідэнта і Дзяржаўнага сакратара па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды.

Пасол і падначалены яму персанал вядуць маніторынг выпадкаў праследаванняў і дыскрымінацыі на рэлігійнай глебе ў краінах свету і выпрацоўваюць стратэгію дзейнасці, накіраванай на скарачэнне колькасці

парушэнняў. Не менш важным накірункам іх работы з'яўляецца выпрацоўка стратэгіі дзейнасці па забеспячэнні і развіцці свабоды веравызнання, якая накіравана на барацьбу з карэннымі прычынамі праследаванняў і з'яўляецца сродкам рэалізацыі іншых інтарэсаў ЗША, такіх, як абарона іншых асноўных правоў чалавека, садзейнічанне развіццю сталых дэмакратый і вядзенне вайны супраць тэрарызма.

Гэтыя стратэгіі рэалізуюцца living рознымі спосабамі з выкарыстаннем інструментаў дыпламатыі, уключаючы як афіцыйныя, так і неафіцыйныя перамовы з рознымі замежнымі дзяржаўнымі ўстановамі, удзел у міжнародных форумах, такіх, як Арганізацыя міжнародных нацый і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, супрацоўніцтва з няўрадавымі арганізацыямі, якія займаюцца пытаннямі правоў чалавека і рэлігійнай дзейнасці, правядзенне сустрэч з ахвярамі праследаванняў. Часта Пасол і яго супрацоўнікі дзейнічаюць сумесна з іншымі прадстаўнікамі дзяржаўных устаноў ЗША. Разам з імі яны ажыццяўляюць прамое ўмяшанне ў канкрэтныя крызісныя сітуацыі з тым, каб упэўніць вернікаў звярнуць з небяспечнага шляху ці прадухіліць іх далейшае праследаванне.

Ва ўсіх выпадках Аддзел укамплектаваны вопытнымі дзяржаўнымі служачымі і супрацоўнікамі дыпламатычных службаў, працуе ў цесным узаемадзеянні са сваімі калегамі з розных аддзелаў Дзяржаўнага дэпартамента, Урада ЗША і дыпламатычных місій за мяжой. Супрацоўнікі дыпламатычных службаў ЗША за межамі краіны ствараюць перадавы атрад, які праводзіць нашу палітыку ў адносінах забеспячэння свабоды веравызнання. Многія аспекты іх дзейнасці, а таксама дзейнасць Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды, апісваюцца ў Раздзеле III "Рэзюмэ дакладу". Аднак некаторыя іх дзеянні павінны заставацца ў цені з тым, каб абараніць асоб, якія маюць да іх дачыненне.

**Штогадовы даклад**

Мэты і задачы дзейнасці Пасла па асобых даручэннях зазначаны ў Законе аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе (IRF) 1998 года, які таксама

прадугледжвае складанне "Штогадовага дакладу аб свабодзе веравызнання ў краінах свету". Дадзены дакумент з'яўляецца чацвёртым выданнем даклада. Мэтай штогадовага дакладу з'яўляецца прадстаўленне зыходнай фактычнай інфармацыі аб узроўні захавання свабоды веравызнання ў краінах свету, якая дазваляе высвятліць існуючыя праблемы і можа служыць першакрыніцай для фарміравання палітыкі ЗША па забеспячэнню свабоды веравызнання. Першыя тры выданні падвяргаліся, у асноўным, крытыцы ўрадамі-парушальнікамі і былі адобраны праваахоўнымі неўрадавымі арганізацыямі як дакументы, якія прадстаўляюць сабой афіцыйныя даведачныя выданні па праследаванню на рэлігійнай глебе.

На пачатку выканання абавязкаў у якасці другога Пасла ЗША па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды, я хацеў бы выказаць сваю падзяку ўсім служачым Дзяржаўнага дэпартамента, якія працуюць як тут, так і за межамі ЗША, дзякуючы якім стала магчымай падрыхтоўка гэтага дакладу. У прыватнасці, я хацеў бы адзначыць самаадданую работу нашых супрацоўнікаў, якія займаюцца пытаннямі захавання правоў чалавека ў многіх рэгіёнах свету, а таксама супрацоўнікаў Аддзела справаздач па краінах і пытаннях прадстаўлення прыстанішча, якія на працягу доўгага часу напружана працавалі падчас падрыхтоўкі дакладу. Я таксама хацеў бы выказаць удзячнасць за ўсебаковую падтрымку, якая была аказана па гэтаму пытанню членамі Кангрэсу ад абедзвюх партый. І, урэшце, я хачу падзякаваць сваім супрацоўнікам, якія працуюць у Аддзеле міжнароднай рэлігійнай свабоды, чыя адданасць справе забеспячэння свабоды веравызнання з'яўляецца прыкладам, вартым пераймання.

Дадзены чацвёрты "Штогадовы даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету" падрыхтаваны з мэтай садзейнічання рэалізацыі нашай мэты забеспячэння і абароны свабоды веравызнання для ўсіх.

Джон В. Хэнфард III

Пасол па асобых даручэннях па пытаннях міжнароднай рэлігійнай свабоды

**Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.: Рэзюмэ дакладу**

**<u>Рэзюмэ</u>**

У 1948 г. Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прыняла "Усеагульная дэкларацыю правоў чалавека" (УДПЧ), якая абвясціла "годнасць ... і роўныя і неад'емныя правы ўсіх членаў чалавечай сям'і". У дэкларацыі адзначана, што "пагарджанне і непавага ў адносінах да правоў чалавека прывялі да здзяйснення варварскіх актаў, якія ўзрушылі чалавецтва". Яна абвясціла ў якасці аднаго з самых высокіх імкненняў чалавецтва стварэнне свету, у якім людзі маглі б карыстацца свабодай веравызнання. У Артыкуле 18 МДПЧ абвешчана, што "Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду змяняць сваю рэлігію ці перакананні і свабоду спавядаць сваю рэлігію ці перакананні як аднаасобна, так і ў суполцы з іншымі, публічна ці ў прыватным парадку ў навучанні, богаслужэнні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў."(гл. Дадатак А).

У сапраўдны час існуе шэраг міжнародных пагадненняў, які абавязвае дзяржавы прытрымлівацца свабоды веравызнання. (Гл. Дадатак В). Урады пераважнай большасці краін прынялі на сябе абавязацельства абараняць згодна гэтым пагадненням права на свабоду веравызнання ўсіх, хто пражывае ў межах гэтых краін.

І ўсё ж, нягледзячы на існаванне гэтых прызнаных усімі міжнародных дакументаў, якія абараняюць свабоду веравызнання, у некаторых краінах застаюцца значныя адрозненні паміж прынятымі абавязацельствамі і іх практычным выкананнем. Значная частка насельніцтва свету жыве ў краінах, дзе права на свабоду веравызнання абмяжоўваецца ці падвяргаецца забароне. Гэта недапушчальнае разыходжанне паміж

словам і справай можна растлумачыць шэрагам умоў, якія існуюць на некалькіх узроўнях.

Найбольш трывожным тлумачэннем з'яўляецца прадаўжэнне існавання таталітарных і аўтарытарных рэжымаў, якія імкнуцца кантраляваць рэлігійныя вераванні і рэлігійную абрадавую практыку. Гэта непазбежна прыводзіць да ганенняў. Некаторыя рэжымы варожа ставяцца да "непацверджаных афіцыйна" рэлігійных меншасцяў, іншыя – праяўляюць цярпімасць да праследаванняў і дыскрымінацыі і тым самым падтрымліваюць іх. Хаця акты насілля супраць рэлігійных меншасцяў могуць быць выкліканы шэрагам фактараў, напрыклад, этнічнымі прычынамі ці пагрозай бяспецы, такая "шматпрычыннасць" не павінна азначаць, што рэлігія дрэнная. Некаторыя ўрады, часта альбо дэмакратычныя, альбо тыя, што імкнуцца да станаўлення дэмакратычнага парадку, прымаюць дыскрымінацыйныя законы, надзяляючы перавагай пажаданую імі рэлігію і ставячы у неспрыяльныя ўмовы іншыя канфесіі.

Некаторыя дэмакратычныя дзяржавы Заходняй Еўропы праводзяць палітыку, накіраваную на ганьбаванне рэлігійных меншасцяў, і тым самым адносяць іх неабгрунтавана і часта неправамерна да небяспечных "сект" ці "культаў". Такая практыка прадстаўляе сабой асобую пагрозу ў сувязі з тым, што некаторыя краіны, якія імкнуцца да развіцця дэмакратыі, а таксама некаторыя недэмакратычныя дзяржавы прымаюць "антыкультавыя" законы і меры, якія часткова асноўваюцца на законах і мерах, існуючых у Заходняй Еўропе. У недэмакратычных дзяржавах, дзе адсутнічаюць традыцыі прытрымлівання правоў чалавека і забеспячэння верхавенства закону, выкананне "антыкультавых" законаў можа лёгка прыняць формы праследавання вернікаў.

Практыка пастанаўленняў, якія абавязваюць рэлігійныя групы рэгістравацца перад пачаткам рэлігійнай дзейнасці, такой, як выкананне рэлігійных абрадаў, можа прывесці да злоўжывання з боку мясцовых органаў улад, нават у выпадках, калі цэнтральныя ўлады мелі намер выключыць дыскрымінацыю пры іх ужыванні. Заканамерныя апасенні ў

адносінах да дэструктыўных і процівапраўных паводзін невялікай колькасці груп не павінны прыводзіць да неабгрунтаванага асуджэння цэлых канфесій.

Пры падрыхтоўцы дадзенага дакладу на ўвагу прымаўся ўплыў гісторыі, культуры і традыцый на палітыку ў адносінах да свабоды веравызнання. Адна рэлігія можа дамініраваць у жыцці краіны на працягу стагоддзяў, што ўскладняе прызнанне новых канфесій, могучых стаць вынікам праблем як у сферы культуры, так і ў вобласці тэалогіі. Аднак традыцыі і культура не павінны выкарыстоўвацца ў якасці прычыны прыняцця законаў і мераў, якія абмяжоўваюць шчырыя рэлігійныя вераванні ці іх законныя праяўленні. Міжнародныя акты дазваляюць уводзіць юрыдычныя абмежаванні рэлігійнай дзейнасці. Такія абмежаванні, аднак, павінны прымяняцца ўзважана і аб'ектыўна, у мінімальным аб'ёме і без дыскрымінацыі якіх-нібыта канфесій.

І, урэшце, палітычныя і практычныя меры, якія прымаюцца дзяржавай у адносінах да свабоды веравызнання, павінны параўноўвацца з міжнароднымі нормамі. ЗША прызнаюць узятую на сябе адказнасць па захаванню гэтых норм пры забеспячэнні і абароне свабоды веравызнання.

"Рэзюмэ дакладу" складаецца з трох раздзелаў. Раздзел І змяшчае інфармацыю аб шэрагу краін, дзе абмяжоўваецца свабода веравызнання, дзеянні і палітыка якіх падзяляюцца на пяць катэгорый. У Раздзеле ІІ прыводзяцца прыклады краін, урады якіх прынялі меры па развіццю ці абароне свабоды веравызнання, нягледзячы на тое, што ў большасці выпадкаў у гэтых краінах застаюцца сур'ёзныя праблемы. У Раздзеле ІІІ апісваюцца дзеянні, якія былі здзейснены ўрадам ЗША для таго, каб заахвоціць іншыя краіны да захавання і развіцця свабоды веравызнання.

Да ведама чытача, некаторыя краіны могуць быць згаданы ў розных раздзелах рэзюмэ ў залежнасці ад таго, якія віды дзейнасці і сітуацыі апісваюцца ў адпаведным раздзеле. У Раздзеле І некалькі краін могуць быць указаны ў больш чым у адной з пяці катэгорый; аднак, дзеля

сцісласці, краіна ўказваецца толькі ў адной катэгорыі, якая найбольш дакладна характарызуе асноўныя перашкоды прытрымлівання свабоды веравызнання ў гэтай краіне.

## Раздзел I: Перашкоды захавання свабоды веравызнання ў краінах свету

### Спробы таталітарных ці аўтарытарных рэжымаў кантраляваць рэлігійныя вераванняі і рэлігійную дзейнасць

Таталітарныя і аўтарытарныя рэжымы вызначаюцца па высокай ступені кантролю, што ўстанаўліваецца імі над свабодай думкі і слова і ў асаблівасці над іншадумствам. У многіх выпадках гэтыя рэжымы разглядаюць некаторыя ці ўсе рэлігійныя групы, як варожыя дзяржаве з-за характару іх рэлігіі ў сувязі з тым, што сама гэтая дзейнасць пагражае пануючай ідэалогіі (часта тым, што выводзіць іх прыхільнікаў з-пад кантролю гэтай ідэалогіі ў недзяржаўную сферу ўплыву), з-за этнічнага характару рэлігійнай групы або груп, ці ўсіх трох азначаных фактараў. Пры наяўнасці аднаго ці больш з гэтых фактараў часта адбываецца падаўленне рэлігіі рэжымам.

**Бірма**. Урад працягвае разглядаць рэлігійную свабоду з пункту гледжання пагрозы, якую яна можа прадстаўляць для нацыянальнага адзінства. Урад пры выкарыстанні органаў бяспекі шляхам укаранення агентаў ці ажыццяўленняназірання кантраляваў правядзенне сходаў і дзейнасць практычна ўсіх арганізацый, уключаючы рэлігійныя. Усе публікацыі, у тым ліку рэлігійныя, падвяргаліся кантролю і цэнзуры. Іншы раз забаранялася правядзенне вулічных мітынгаў. Дзяржаўныя ўлады працягваюць аддаваць перавагу тэравада-будызму, рэлігіі большасці насельніцтва і ў той жа час ажыццяўляюць кантроль над дзейнасцю арганізацыі шляхам абмежавання дзейнасці і свабоды выказвання думак святароў. Урад сістэматычна абмяжоўваў спробы будысцскіх святароў садзейнічаць развіццю правоў чалавека і палітычных свабод, не адабраў і часам забараняў будаўніцтва

рэлігійнымі меншасцямі новых месцаў выканання рэлігійных абрадаў. У шэрагу месцаў ажыццяўляў прымусовае распаўсюджванне будызму сярод насельніцтва, якое спавядала іншыя рэлігіі. Маюцца таксама паведамленні, заслугоўваючыя даверу, аб тым, што ўзброеныя сілы гвалтам перавярнулі ў будызм сотні веруючых-хрысціян племені Нага. Працягваліся акты насілля супраць мусульман, і павялічылася колькасць паведамленняў аб увядзенні абмежаванняў на іх перамяшчэнне і рэлігійную дзейнасць.

**Кітай**. Непацверджаныя афіцыйна рэлігійныя і духоўныя групы заставаліся пад наглядам і ў некаторых выпадках падвяргаліся жорсткім рэпрэсіям. Урад працягваў абмяжоўваць рэлігійную дзейнасць, але дазваляў яе ажыццяўленне арганізацыям, якія былі зацверджаны дзяржаўнымі органамі ў зарэгістраваных месцах адпраўлення рэлігійных абрадаў, а таксама кантраляваць рост і маштабы дзейнасці рэлігійных груп з мэтай прадухілення ўзнікнення магчымых сфер ўплыву, якія не знаходзіліся пад урадавым кантролем. Урад працягваў і ў шэрагу месцаў актывізаваў агульнанацыянальную кампанію па выкананю пастанаўленняў, якія прадугледжваюць абавязковую рэгістрацыю ўсіх месцаў правядзення рэлігійнай дзейнасці, у дзяржаўных бюро па справах рэлігійі іх пераход пад нагляд афіцыйных "патрыятычных" рэлігійных арганізацый. Як і ў мінулыя гады, урад прымаў меры супраць непадкантрольных яму рэлігійных арганізацый, якія надзвычай буйна расквітнелі ці спавядалі вераванні, якія разглядаліся як пагроза бяспецы дзяржавы. Паліцыя закрывала "падпольныя" мячэці, храмы, семінарыі, ліквідавала вялікую колькасць каталіцкіх цэркваў і пратэстантскіх малітвеных дамоў, многія з якіх мелі вялікую колькасць прыхаджан, валодалі значнай маёмасцю, фінасавымі сродкамі і мелі развітую структуру. Забараняліся таксама групы, якія лічыліся "культамі". Асаблівым праследаванням, допытам, затрыманню і фізічнаму насіллю, уключаючы пыткі, падвяргаюцца кіраўнікі рэлігійных груп, што не санкцыяніраваны ўладамі. Члены гэтых груп таксама могуць падвяргацца падобнаму абыходжанню. Урад працягвае праводзіць жорсткія рэпрэсіі ў адносінах да групы Фалун Гонг і іншых, якіх ён лічыць "ерытычнымі культамі". З розных крыніц паступаюць паведамленні, што

тысячы членаў групы Фалун Гонг былі падвергнуты арыштам, затрыманню, турэмнаму зняволенню, а некалькі соцен з іх пайшлі з жыцця за кратамі ў перыяд з 1999 г. Застаецца высокім ўзровень рэпрэсій на рэлігійнай глебе ў Тыбеце, дзе таксама застаюцца нездавальняючымі адносіны ўрада да захавання свабоды веравызнання. Рэлігійная дзейнасць працягвала падвяргацца абмежаванням, хаця ў цэлым ужыванне гэтых абмяжаванняў было менш жорсткім, чым у папярэднім годзе. Паліцыя працягвала падаўленне рэлігійнай дзейнасці і ліквідацыю месцаў адпраўлення рэлігійных абрадаў мусульман, якіх абвінавачвалі ў сепаратызме, у Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне. Некаторыя ўйгуры і мусульмане абвінавацілі ўрад ў тым, што ён выкарыстоўвае барацьбу з тэрарызмам у якасці падставы для актывізацыі падаўлення рэлігійнай дзейнасці ў Сіньцзяне.

**Куба**. Урад працяваў падтрымліваць высокі ўзровень кантролю над рэлігійнай дзейнасцю. Вернікі афіцыйных канфесій часта падвяргаліся сачэнню, якое вялося органамі дзяржаўнай бяспекі. Урад адмаўляўся рэгістраваць большасць новых рэлігійных канфесій у той час, як незарэгістраваныя рэлігійныя групы працягвалі заставацца аб’ектамі рознага роду ўмяшанняў дзяржаўных органаў, уціску і рэпрэсій. Хаця заканадаўства і дазваляе ажыццяўляць будаўніцтва цэркваў, урад рэдка калі санкцыянаваў такое будаўніцтва і тым самым вымушаў многія храмы звяртацца за дазволамі на правядзенне богаслужэнняў у прыватных дамах. Дзейнасць цэркваў па арганізацыі школ, навучанню членаў рэлігійных суполак, таксама, як і публікацыі рэлігійных матэрыялаў, забараняліся ці падвяргаліся жорсткім абмежаванням.

**Лаос**. Нягледзячы на некаторыя станоўчыя змены, свабода веравызнання працягвала абмяжоўвацца. Народная рэвалюцыйная партыя Лао (НРПЛ) і ўрад працягвалі дзейнічаць згодна са сваёй вузкай інтэрпрэтацыяй канстытуцыйнага палажэння аб свабодзе веравызнання і тым самым забаранялі займацца рэлігійнай дзейнасцю ўсім грамадзянам, у асаблівасці тым, хто належаў да рэлігійных меншасцяў, і, у прыватнасці, да хрысціянства, і не спавядаў асноўны накірунак будызму. Хаця ў

афіцыйных заявах прызнаецца існаванне розных рэлігій, там жа падкрэсліваецца, што гэтыя рэлігіі спрыяюць раздзяленню, узнікненню рознагалоссяў або дэстабілізацыі. Усе рэлігійныя групы, у тым ліку будысты, спавядалі сваю веру ва ўмовах самавольнага прымянення законаў. Многія дзяржаўныя чыноўнікі трактуюць канстытуцыю як забараняючую любую рэлігійную дзейнасць, якая мае на мэце місіянерства і схіленне да новай веры, а хрысціянства разглядаецца як рэлігія, якая асабліва спрыяе стварэнню сацыяльных супярэчнасцяў. Дзяржаўныя чыноўнікі ў некаторых рэгіёнах працягвалі спрабаваць вымусіць вернікаў адмовіцца ад сваёй веры. Улады закрылі некалькі дзесяткаў цэркваў, разам з тым было дазволена зноў адкрыць некалькі цэркваў, якія былі закрыты ў мінулыя гады. Напрыканцы перыяда, які ахоплівае дадзены даклад, было вядома аб 19 веруючых (усе хрысціяне), падвяргнутых турэмнаму зняволенню і затрыманых па рэлігійных матывах. (Заўвага: 9 зняволеных з гэтай колькасці былі вызвалены ў ліпені, хутка пасля заканчэння справаздачнага перыяду).

**Паўночная Карэя**. Урад працягваў падаўляць арганізаваную рэлігійную дзейнасць за выключэннем дзейнасці, якая ажыццяўлялася афіцыйна прызнанымі групамі, звязанымі з урадам. Па шматлікіх паведамленнях рэлігійных і праваахоўных груп, якія дзейнічалі за межамі краіны, мелі месца збіванне, арышты і забойствы членаў падпольных цэркваў. Па словах сведак, абыходжанне са зняволеннымі, якія трапілі за краты з-за сваіх рэлігійных поглядаў, было больш жорсткім, чым з іншымі пазбаўленымі волі. Па некаторых паведамленнях, тыя, хто займаецца місіянерскай дзейнасцю альбо мае сувязі з замежнымі евангелічыскімі групамі, якія дзейнічалі цераз граніцу з Кітаем, падвяргаліся арыштам і суровым пакараннем, уключаючы смяротнае. Хаця такія паведамленні вельмі складана пацвердзіць, агульны аб'ём інфармацыі аб асобных выпадках прыняцця жорсткіх мераў з мэтай спынення несанкцыянаванай рэлігійнай дзейнасці дазваляе мяркаваць, што такія паведамленні з'яўляюцца верагоднымі.

**В'етнам**. Урад працягваў абмяжоўваць дзейнасць рэлігійных груп, якую ён аб'явіў не адпавядаючай законам і палітыцы дзяржавы. Працягвалі дзейнічаць абмежаванні ў адносінах да структуры і святароў гэтых груп. У той жа час урад ажыццяўляў кантроль над дзейнасцю афіцыйна прызнаных рэлігій. Рэлігійныя групы сутыкаліся з цяжкасцямі падчас навучання і ўзвядзення ў сан святароў, а таксама на працягу ажыццяўлення адукацыйнай і гуманітарнай дзейнасці. Заслужваюць даверу паведамленні аб тым, што на працягу апошніх некалькіх гадоў хрысціяне-пратэстанты племяні Хмонг, пражываючыя ў некалькіх вёсках на паўночным захадзе краіны, былі вымушаны пад уплывам мясцовых улад адмовіцца ад сваёй веры. Гэтых вернікаў-пратэстантаў таксама абвінавацілі ў незаконным выспавяданні веры і прыгаварылі да турэмнага зняволення на тэрміны да 3 гадоў за "злоўжыванне свабодай слова, друку і веравызнання". Паступалі паведамленні аб тым, што дзяржаўныя чыноўнікі фабрыкавалі доказы, і што некаторыя палажэнні закона, які выкарыстоўвалі для асуджэння гэтых зняволеных па рэлігійных матывах, супярэчылі нормам міжнародных актаў, такіх, як "Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека". Па тых жа дакладных паведамленнях, паліцыя здзяйсняла адвольнае затрыманне людзей з-за іх рэлігійных вераванняў і рэлігійнай дзейнасці, у асаблівасці, у горных раёнах, дзе пражываюць этнічныя меншасці.

**Варожыя адносіны дзяржавы да рэлігійных меншасцяў альбо не прызнаных афіцыйна канфесій**

Некаторыя ўрады могуць не ажыццяўляць праграм кантролю над дзейнасцю рэлігійных меншасцяў, але, тым не менш, варожа ставяцца да вызначаных рэлігійных меншасцяў альбо да плыняў унутры рэлігійных груп, якія класіфікуюцца як фарміраванні, прадстаўляючыя "пагрозу бяспецы". Гэтыя ўрады прытрымліваюцца палітыкі, накіраванай на тое, каб запалохаць вызначаныя групы, схіліць іх да прыняцця іншай веры ці прымусіць збегчы з краіны.

**Іран**. Дзеянні ўраду працягвалі ствараць пагражальную атмасферу для некаторых рэлігійных меншасцяў. Усе гэтыя групы падвяргаліся ў рознай

ступені афіцыйна санкцыянаванай дыскрымінацыі, асабліва ў вобласці працоўнай дзейнасці, адукацыі, жылля. Урад распальваў антыбахаісцкія і антыяўрэйскія настроі ў палітычных цэлях. Бахаісты, яўрэі, хрысціяне, мандаіны, мусульмане-суфіты паведамлялі аб зняволеннях у турмах, прыгнёце і запалохваннях, якім падвяргаліся яны з-за сваіх рэлігійных вераванняў. Сама меней чатыры бахаістаў да гэтай пары ўсё яшчэ знаходзяцца за кратамі, куды яны трапілі па прычынах, звязаных з выспавяданнем імі сваёй веры. Застаюцца ў турме і восем яўрэяў. Іх асудзілі за супрацоўніцтва з варожым урадам, прыналежнасць да нелегальнай арганізацыі і вярбоўку ў члены нелегальнай арганізацыі. Права ўласнасці бахаістаў, як правіла, ігнараваліся. Заснаваныя на рэлігіі законы выкарыстоўваліся для падаўлення свабоды слова. Закрываліся незалежныя газеты і часопісы, а вядомыя выдаўнікі і журналісты падвяргаліся турэмнаму зняволенню па няпэўным абвінавачанням, такім як “знявага ісламу” або “выказванне сумнення ў адносінах да ісламскіх асноваў рэспублікі”.

**Ірак**. Урад працягваў праводзіць палітыку сістэматычнага і бязлітаснага праследавання шыітаў. Ён жорстка абмяжоўваў альбо забараняў многія рэлігійныя абрады шыітаў і ў той жа час (як гэта рабілася на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў) праводзіў лютую кампанію забойстваў, публічных смяротных пакаранняў і затрыманняў на доўгі тэрмін рэлігійных лідэраў шыітаў і прыхільнікаў шыізму. Прадстаўнікі рэжыму апаганьвалі шыіцкія мячэці і святыя месцы, зрывалі рэлігійныя абрады і ўмешваліся ў рэлігійнае навучанне шыітаў. Рэжым забараніў перадачу праграм шыітаў па падкантрольнаму ўраду радыё і тэлебачанню і публікацыю шыіцкай літаратуры. Паведамлялася, што ўрад ішоў на розныя злоўжыванні ў адносінах да асірыйскіх і халдзейскіх хрысціянаў, якія пражываюць у краіне. У асаблівасці гэта тычыцца іх выціснення з паўночных рэгіёнаў і падаўлення іх палітычных правоў.

**Пакістан**. Урад не забяспечыў абарону правоў нацыянальных меншасцяў як з-за дзяржаўнай палітыкі, так і ў выніку свайго нежадання прымаць меры супраць грамадскіх сіл, якія варожа ставяцца да тых, хто спавядае іншую

рэлігію. На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, працягваліся акты насілля на глебе сектанцкіх і рэлігійных адрозненняў. Найбольш бязлітасныя акты насілля на рэлігійнай глебе былі накіраваны супраць шыіцкай меншасці краіны, якое працягвала падвяргацца непрапарцыянальна шырокаму праследаванню ў выглядзе адзінкавых і масавых забойстваў. Закон працягваў абмяжоўваць рэлігійную дзейнасць секты Ахмадзі. Яе члены часта становіліся ахвярамі насілля на рэлігійнай глебе, да якога ў большасці выпадкаў падбухторвалі рэлігійныя экстрэмісты. Шэраг масавых забойстваў, здзейсненых ў мячэцях і цэрквах, уключаючы нападзенне на царкву ў Ісламабадзе, у выніку чаго былі забіты пяць чалавек, двое з якіх з'яўляліся грамадзянамі замежных дзяржаў, паставілі пад сумненне здольнасць урада прадухіляць насілле, якое ажыццяўлялася на глебе сектанцкіх і рэлігійных адрозненняў. Урад працягваў выкарыстоўваць "Прадпісанні Худуд", прадугледжваючых прымяненне розных стандартаў пры разгляданні доказаў да мусульман і немусульман, мужчын і жанчын, якія абвінавачваліся ў парушэнні ісламскага заканадаўства. Урад таксама пакідае у сіле закон аб богазневажанні, які выкарыстоўвалі варожымі праціўнікамі і ўладамі з мэтай запалохвання, пакарання і турэмнага зняволення ахмадзістаў, хрысціян і артадаксальных мусульман.

**Саудаўская Аравія**. У Саудаўскай Аравіі не існуе свабоды веравызнання. Урад патрабуе, каб усе грамадзяне былі мусульманамі і забараняе ўсе публічныя праяўленні любой веры, акрамя ісламa. Адпраўленне мусульманамі рэлігійных абрадаў абмяжоўваецца прадпісаннямі сунізму – плыні ісламу ў тлумачэнні Мухамада Ібн Абд Аль-Вахаба – рэлігійнага дзеяча-рэфарміста 18 стагоддзя. Усе іншыя абрады, якія супярэчаць гэтаму тлумачэнню, забаронены. Члены рэлігійнай меншасці шыітаў працягвалі падвяргацца палітычнай і эканамічнай дыскрымінацыі на дзяржаўным узроўні, уключаючы абмежаванні ў адпраўленні рэлігійных абрадаў. Многія шыіцкія шэйхі пабывалі ў зняволенні.

Урад публічна заяўляў, што прызнае права немусульман спавядаць рэлігію ва ўласным парадку, аднак адрозненне паміж публічным і аднаасобным адпраўленнем рэлігійных абрадаў дакладна не вызначана, на практыцы

вымушаючы большасць немусульман таемна адпраўляць рэлігійныя абрады. Некалькі хрысціян былі затрыманы за адпраўленне немусульманскіх рэлігійных абрадаў і амаль ва ўсіх выпадках іх дэпартавалі пасля працяглага арышту, падчас якога некаторых з іх секлі. Урад адмаўляў у выдачы дазволу на ўезд у краіну святарам для правядзення немусульманскіх царкоўных богаслужэнняў, што ставіла ў асабліва нязручнае становішча шэраг рэлігійных груп, такіх, як католікі і праваслаўныя хрысціяне, якія павінны ўвесь час мець пры сабе святара для спавядання сваёй веры. Мытныя чыноўнікі канфіскоўвалі альбо падвяргалі цэнзуры матэрыялы, якія лічыліся зняважлівымі або непрыстойнымі, у тым ліку біблію і відэакасеты рэлігійнага зместу. У некаторых раёнах супрацоўнікі Мутаваін (рэлігійная паліцыя) і рэлігійныя актывісты падвяргалі знявагам, затрымлівалі і нападалі на мясцовых жыхароў і іншаземцаў.

**Судан**. Грамадзянская вайна, якую вядзе ўрад на працягу 19 гадоў, з'яўляецца асноўнай прычынай злоўжыванняў і парушэнняў гуманітарных нормаў, такіх, як падпалы і грабяжы вёсак, голад сярод тысяч жыхароў паўднёвых раёнаў, забойствы, згвалтаванні, затрыманні грамадзянскіх асоб, большасць якіх складаюць хрысціяне і жыхары, спавядаючыя традыцыйныя мясцовыя рэлігіі. Урад таксама працягваў мэтанакіраваныя бамбардзіроўкі грамадзянскіх цэляў. У раёнах ваенных дзеянняў працягваліся выкраданні жанчын і дзяцей, а таксама захоп людзей гандлярамі рабамі пры падтрымцы ўрада. Большасць ахвяр у вёсках складалі хрысціяне і жыхары, якія спавядаюць традыцыйныя мясцовыя рэлігіі. Некаторыя з гэтых ахвяр з'яўляліся членамі сем'яў, дзе спавядаліся хрысціянства і іншыя немусульманскія рэлігіі. Яны былі сілком схілены да прыняцця ісламу. Паведамлялася, што ісламскія няўрадавыя арганізацыі ў раёнах ваенных дзеянняў не аказвалі паслуг, такіх, як забеспячэнне медыцынскай і харчовай дапамогай да таго часу, пакуль людзі не былі вымушаны прымаць ісламскую веру. Паведамлялася таксама, што хрысціянскія няўрадавыя арганізацыі, карысталіся паслугамі, якія былі імі аказаны з мэтай ціску на жыхароў з мэтай пераварочвання іх у хрысціянства.

Прызнанне ўрадам ісламу ў якасці дзяржаўнай рэлігіі спрыяла стварэнню ўмоў, пры якіх немусульман лічаць жыхарамі другога сорту ва ўсіх рэгіёнах краіны. У падкантрольных ураду паўднёвых раёнах былі адзначаны сведчанні праяўлення фаварытызму ў адносінах да мусульман і правядзення тайнай палітыкі ісламізацыі дзяржаўных устаноў, нягледзячы на тое, што афіцыйная палітыка прадугледжвае існаванне мясцовай аўтаноміі і федэралізму. Паведамлялася, што рэлігійным групам, у асаблівасці хрысціянам-пратэстантам, вельмі цяжка прайсці рэгістрацыю, якая з’яўляецца для іх абавязковай. Урад працягваў адмаўляць у выдачы дазволу на будаўніцтва рымска-каталіцкіх цэркваў.

**Туркменістан**. Урад краіны працягвае ўводзіць абмежаванні свабоды рэлігійнага самавыяўлення. Закон аб рэлігійных арганізацыях патрабуе для атрымання афіцыйнага юрыдычнага статусу, каб рэлігійная група мела не менш 500 членаў у кожнай мясцовасці, дзе яна збіраецца рэгістравацца. Адзінымі рэлігіямі, якія паспяхова прайшлі працэдуру рэгістрацыі, з'яўляюцца ісламскі сунізм і Руская праваслаўная царква. Гэтыя рэлігіі кантралююцца ўрадам. Урад жорстка абмяжоўвае дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных кангрэгацый, забараняе ім праводзіць публічныя сходы, займацца місіянерскай дзейнасцю і распаўсюджваць рэлігійныя матэрыялы. Тлумачэнне закона ўрадам прадугледжвае жорсткае абмежаванне свабоды сходаў і адпраўлення абрадаў у прыватным парадку. Некалькі членаў рэлігійных меншынстваў былі дэпартаваны з краіны.

Некаторыя наглядальнікі адзначалі, што афіцыйныя абмежаванні свабоды веравызнання, атрыманыя ў спадчыну ад савецкай эпохі, адлюстроўваюць асцярогу ўраду, які лічыць, што ліберальная палітыка ў рэлігійнай сферы можа прывесці да палітычнага расколу, у тым ліку і з'яўлення ў краіне ісламскіх экстрэмісцскіх рухаў. Па ўсёй бачнасці, урад лічыць, што ўдзел у нетрадыцыйных канфесіях і іх падтрымка прадстаўляюць пагрозу стабільнасці і нейтральнаму статусу дзяржавы.

**Узбекістан**. Урад дзяржавы дапускае дзейнасць асноўных рэлігій; разам з тым ён працягвае кампанію па прыняццю жорсткіх мер супраць

несанкцыяваных ісламскіх груп, што падазраюцца ў антыдзяржаўных настроі ці дзейнасці. У асноўным, дапускаецца дзейнасць хрысціянскіх цэркваў, калі яны не спрабуюць шукаць кандыдатаў на пераварочванне ў хрысціянства сярод этнічных узбекаў. Шэраг рэлігійных меншасцяў, у тым ліку кангрэгацыі розных хрысціянскіх канфесій, а таксама бахаісты і крышнаіты, сутыкнуліся з цяжкасцямі з-за строгасці патрабаванняў, якія былі ўстаноўлены заканадаўствам ва ўмовах рэгістрацыі. Заканадаўства краіны, якое мае найбольш жорсткі характар абмежаванняў у параўнанні з іншымі краінамі Цэнтральнай Азіі, строга абмяжоўвае такія віды дзейнасці, як місіянерства, увязенне і распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры, рэлігійнае навучанне. Іншыя забароненыя віды дзейнасці ўключаюць арганізацыю незаконнай рэлігійнай групы і прымушванне іншых да ўступлення ў такую групу. Незаконнай з'яўляецца любая служба, якая праводзіцца незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыяй. Закон забараняе групам, якія не маюць зарэгістраванага рэлігійнага цэнтра, ажыццяўляць навучанне персаналу рэлігійных структур. На практыцы гэтыя абмежаванні ліквідуюць амаль усе свабоды, прызнаныя як міжнародныя стандарты. Крымінальны і грамадзянскі кодэксы прадугледжваюць строгія пакаранні за парушэнне закону аб рэлігіі і іншых актаў, рэгулюючых рэлігійную дзейнасць.

**Ігнараванне дзяржавай праблемы дыскрымінацыі або праследавання рэлігійных меншасцяў ці не прызнаных афіцыйна рэлігій**

У некаторых краінах урады прымаюць законы і праводзяць палітыку, накіраваныя на прадухіленне дыскрымінацыі і праследаванняў на рэлігійнай глебе, аднак яны не праводзяць дастаткова паслядоўных і актыўных мераў супраць парушэнняў свабоды веравызнання недзяржаўнымі структурамі альбо супрацоўнікамі мясцовых праваахоўных органаў.

**Бангладэш**. Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя гарантуе грамадзянам права на выспавяданне рэлігіі па свайму ўласнаму выбару, паліцыя часта не спяшаецца аказваць дапамогу членам рэлігійных меншасцяў, якія сталі ахвярамі злачынстваў, і тым самым садзейнічаюць стварэнню атмасферы

беспакаранасці. Рост злачынстваў і насілля пасля выбараў 2001 г. пагоршыў дадзенае становішча і прывёў да павышэння ўзроўню ўразлівасці рэлігійных меншасцяў. Павялічылася чысло індуістаў, хрысціян і будыстаў, якія пакутвалі ад дыскрымінацыі.

**Беларусь**. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка працягваў праводзіць палітыку апякунства Рускай праваслаўнай царквы – галоўнай рэлігіі краіны. У той жа час улады ўзмацнілі праследаванне іншых канфесій і рэлігій. Рэжым адмовіў у рэгістрацыі некаторым рэлігійным групам на аснаванні таго, што яны з'яўляюцца “нетрадыцыйнымі”, а таксама было адмоўлена ўсім рэлігійным групам, якіх лічаць “сектамі”. У дзяржаўных сродках масавай інфармацыі працягваліся напады на пратэстанцскую царкву. 27 чэрвеня ніжняя палата парламенту адобрыла новы закон аб рэлігіі, які, у выпадку яго рэалізацыі, яшчэ больш абмяжуе свабоду веравызнання. Законапраект будзе прадстаўлены на разгляданне верхняй палатай восенню. Памеры рэстытуцыі царкоўнай уласнасці, якая была захоплена падчас савецкай і нацысцскай акупацыі, заставаліся абмежаванымі.

**Егіпет**. Адзначаецца тэндэнцыя павышэння ўзроўню выканання і абароны ўрадам свабоды веравызнання. Разам з тым урад працягваў праследаваць грамадзян, у тым ліку мусульман, за неартадаксальныя вераванні і адпраўленне рэлігійных абрадаў і абвінавачваў іх у “знявазе свяшчэнных рэлігій”. Заставаўся доўгім працэс пацвярджэння заявак на будаўніцтва цэркваў, які таксама ў недастатковай меры адпавядаў пажаданням хрысціянскай суполкі. Прадстаўнікі хрысціян сцвярджалі, што сілы бяспекі не дазвалялі выкарыстоўваць выдадзеныя раней дазваленні, а супрацоўнікі мясцовых органаў бяспекі іншы раз блакіравалі альбо затрымлівалі выдачу дазволаў на рамонт царкоўных будынкаў. Па-ранейшаму ў сіле заставаўся дэкрэт 1960 г., згодна якому былі закрыты ўсе арганізацыі і забаронена дзейнасць суполкі бахаістаў. Была канфіскавана ўся маёмасць суполкі бахаістаў. У дзяржаўным сектары існуе дыскрымінацыя немусульман.

**Грузія**. Сітуацыя са свабодай веравызнання пагоршылася за перыяд, ахоплены дадзенай дакладй. Мясцовыя паліцыя і органы бяспекі перыядычна падвяргалі праследаванням групы рэлігійных меншасцяў. Паліцыя не прымала мераў у сувязі з нападзеннямі, якія працягваліся, праваслаўных экстрэмістаў, у асноўным паслядоўнікаў Васілія Мкалавішвілі, і членаў арганізацыі “Джвары” на членаў суполкі Сведкі Іегавы і іншых рэлігійных меншасцяў. У большасці выпадкаў супрацоўнікі мясцовых праваахоўных органаў самі беспакарана ўдзельнічалі ў нападзеннях, колькасць і ступень насілля каторых павялічваліся альбо патуралі іх здзяйсненню. Ніхто не быў асуджаны ці прыгавораны да турэмнага зняволення за ўчыненне гэтых гвалтоўных нападаў.

**Гватэмала**. Урад зрабіў вельмі мала для рэалізацыі “Пагаднення па выкананню нацыянальных традыцый і правоў карэнных народаў”, якое было заключана ў 1995 г. і прадугледжвае павагу да рэлігійных правоў карэнных жыхароў. Пагадненне змяшчае заклік да кангрэсу прыняць закон аб унясенні паправак у канстытуцыю з тым, каб забяспечыць “прызнанне, выкананне і ахову форм духоўна-рэлігійнай абраднасці, якая практыкуецца народнасцямі майя, гарыфуна і ксінка”. Хаця ўрад не праводзіць палітыку дыскрымінацыі, адсутнасць рэсурсаў і палітычнай волі да рэалізацыі існуючых законаў і выканання мірных пагадненняў працягвалі абмяжоўваць свабоднае выражэнне традыцыйных рэлігійных вераванняў карэннага насельніцтва.

**Індыя**. У сакавіку і красавіку 2002 г. у штаце Гуджарат адбыліся сутыкненні паміж прадстаўнікамі рэлігійных суполак, ахвярамі якіх сталі мясцовыя мусульмане. Успышка насілля выкліканага, па ўсёй бачнасці, выпадкамі насілля ў адносінах да індуістаў, паказала цяжкасці, з якімі працягваюць сутыкацца мясцовыя рэлігійныя меншасці. 27 лютага 2002 г. натоўп мусульман здзейсніў напад на поезд у Годхры, штат Гуджарат, у якім знаходзіліся індуісцскія актывісты, якія вярталіся з Айодхі, дзе ў 1992 г. натоўп індуістаў знішчыў мячэць, якая была пабудавана 500 гадоў таму; было падпалена 2 вагоны і 58 пасажыраў забіта. Гэты факт выклікаў выступленні ў адказ індуістаў у Гуджараце і Махараштры, натоўп якіх

граміў мусульманскія магазіны і офісы, гвалтаваў мусульманскіх жанчын. Усяго ў той час былі забіты 950 мусульман. Па неафіцыйных даных, колькасць ахвяр была значна вышэйшай. Па дакладных паведамленнях назіральнікаў, сутыкненні ў Гуджараце былі выкліканы бяздзейнасцю афіцыйных ўладаў і ў некаторых выпадках іх удзелам у гэтых сутыкненнях. Напады на мусульман у Гуджараце адлюстроўваюць напружанасць у адносінах паміж удзельнікамі правячай кааліцыі, якая ўзначальваецца партыяй Бхарація Джаната. Партыя мае сувязі з індуісцскімі шавіністычнымі групамі, якія ў мінулым удзельнічалі ў арганізацыі нападзенняў на прадстаўнікоў рэлігійных меншасцяў. Рост агрэсіўнасці індуіскіх экстрэмістаў таксама, па ўсёй бачнасці, спрыяе ўзмацненню сацыяльнай дыскрымінацыі і выкананню індуістамі асобных актаў насілля ў адносінах да хрысціян у Гуджараце і іншых раёнах Індыі.

**Інданэзія**. Выкананне актаў насілля на рэлігійнай глебе і бяздзейнасць ураду, які не прымае эфектыўных мераў па пакаранню віноўных і прадухіленню нападзенняў, паслужылі прычынай абвінавачанняў у адрас дзяржаўных чыноўнікаў у тым, што яны саўдзельнічалі ў выкананні некаторых актаў насілля або, па меншай меры, дапусцілі іх беспакаранае выкананне. Урад перыядычна патураў парушэнню свабоды веравызнання і сцвярджаў, што не мае рэсурсаў і паўнамоцтваў для стрымлівання "эмоцый" асобных грамадзян і груп, якія нападаюць на іншых з-за іх вераванняў. Як на цэнтральным востраве Сулавесі, так і на Малукскіх астравах у выніку недастаткова эфектыўнай дзейнасці праваахоўных органаў і абмежаванасці мераў па раззбраенню мусульманскіх баевікоў, нягледзячы на існаванне мірных пагадненняў, адбываліся сутыкненні, якія былі выкліканы часткова рэлігійнымі прычынамі. Некаторых службовых асоб армейскіх і паліцэйскіх часцей абвінавачвалі ў тым, што яны станавіліся на бок сваіх адзінаверцаў, як мусульман, так і хрысціян, і аказвалі ім прамую ці ўскосную падтрымку. Акты насілля па рэлігійных матывах, якія мелі месца ў іншых раёнах, у асноўным на востраве Ява, таксама змяшчалі пагрозы і шэраг нападзенняў радыкальных мусульманскіх груп на розныя забаўляльныя ўстановы, такія, як рэстараны, бары і начныя клубы, якія яны лічаць амаральнымі. Урад не

прымаў аніякіх мераў супраць удзельнікаў гэтых нападзенняў, і некаторыя назіральнікі паведамлялі аб сувязях паліцыі з гэтымі групамі.

**Нігерыя**. Прымяненне пашыранай варыянту шарыяту (закону ісламу) ў шэрагу паўночных штатаў перашкаджалі рэалізацыі палажэнняў канстытуцыі, якія гарантуюць свабоду веравызнання. У сакавіку 2002 г. міністр юстыцыі Кану Агабі абнародаваў ліст, адрасаваны губернатарам паўночных штатаў, і ў якім ён зазначаў, што прыгаворы, вынесеныя па закону шарыяту, не павінны быць больш строгімі за прыгаворы, прадугледжаныя агульным свецкім заканадаўствам; аднак, гэты ліст застаўся без увагі. Заставалася высокай міжканфесіальная напружанасць паміж хрысціянамі і мусульманамі, якая стала вынікам шэрагу бязлітасных этна-рэлігійных канфліктаў, уключаючы сутыкненні ў штаце Плата ў верасні 2001 г., падчас якіх загінулі 2300 чалавек. У многіх паўночных штатах па-ранейшаму забаранялася ці абмяжоўвалася місіянерская дзейнасць, хаця яна дазволена канстытуцыяй. Акрамя таго, у многіх штатах урадавыя чыноўнікі ў шэрагу выпадкаў звярталіся да дыскрымінацыі ў адносінах да прадстаўнікоў рэлігійных меншасцяў падчас найму на работу, сдачы дзяржаўных падрадаў і выдачы дазваленняў і ліцэнзій.

**Дыскрымінацыйнае заканадаўства альбо палітыка прыгнечання асобных рэлігійных канфесій**

Некаторыя ўрады прымянялі законы ці пастановы, у якіх было адзначана пануючае палажэнне адных рэлігій і прыгнечанне іншых. Часта гэтыя абставіны тлумачацца дамінуючым становішчам у краіне адной рэлігіі, якое склалася гістарычна, і можа адлюстроўваць скептычныя адносіны шырокай грамадскасці да новых канфесій ці рэлігійных меншасцяў. Іншы раз гэта адбываецца ў краінах, у якіх доўгі час правілі камуністычныя рэжымы, калі рэлігіі былі альбо забаронены, альбо, у лепшым выпадку, знаходзіліся ў няміласці ва ўладаў. У такіх краінах некаторыя слаі грамадства ставяцца са скептыцызмам і іншы раз са страхам да некаторых рэлігій. У многіх выпадках гэтыя абставіны прыводзяць да прыгнечання рэлігійнай свабоды.

**Бруней**. Нягледзячы на палажэнні канстытуцыі, якія рэгламентуюць свабоду веравызнання, урад працягваў абмяжоўваць выспавяданне неісламскіх рэлігій. Немусульманам не дазвалялася займацца місіянерскай дзейнасцю. Урад таксама перыядычна адмаўляў ва ўездзе ў краіну замежным святарам або асобным святарам, архіепіскапам ці прапаведнікам, а таксама у выдачы дазволаў на пашырэнне, рамонт і будаўніцтва новых цэркваў, храмаў і месцаў пакланення. Урад забараняў увязенне рэлігійных вучэбных матэрыялаў і свяшчэнных кніг. У дзяржаўных школах як мусульманкі, так і немусульманкі павінны насіць мусульманскае адзенне, уключаючы пакрыццё галавы.

**Эрытрэя**. У маі 2002 г. урад праінфармаваў усе рэлігійныя групы, што яны павінны зарэгістравацца альбо спыніць усе віды рэлігійнай дзейнасці. У паведамленні таксама адзначалася, што ўсе атрыманыя заяўкі на правядзенне рэгістрацыі будуць разгледжаны дзяржаўнай камісіяй і пацверджаны ў выпадку, калі будзе прызнана, што яны сумяшчальныя з эрытрэйскай культурай. Напрыканцы чэрвеня 2002 г. яшчэ не было прынята рашэнне аб тым, якім групам будзе дазволена рэгістрацыя, аднак, мяркуючы па каментарыях высокапастаўленых дзяржаўных чыноўнікаў, дазваленні на ажыццяўленне рэлігійнай дзейнасці атрымаюць толькі групы, дзейнасць якіх звязана ў значнай ступені з гісторыяй Эрытрэі. Урад працягваў дыскрымінацыю секты Сведкі Іегавы.

**Ізраіль і акупацыйныя тэрыторыі**. Большасць грамадзян неяўрэйскай нацыянальнасці, якія пражываюць у Ізраілі, у асноўным гэта – мусульмане, друзы і хрысціяне, працягвалі падвяргацца розным формам дыскрымінацыі, якая ў шэрагу выпадкаў мела пэўную рэлігійную афарбоўку. Пры выдзяленні ўрадам датацый розным рэлігійым структурам перавага аддавалася яўрэйскім грамадзянам. Многія яўрэйскія грамадзяне пратэставалі супраць таго, што ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам і сучаснай палітыкай Ізраіля, яўрэйскія артадаксальныя рэлігійныя структуры маюць выключнае права ажыццяўляць кантроль над шлюбамі, разводамі і пахаваннямі яўрэйскіх грамадзян. Значна узмацнілася напружанасць у адносінах паміж яўрэямі і неяўрэямі, у асноўным у выніку

араба-ізраільскага канфлікту, насілля і тэрарызму. Акты насілля і палітыка зачыненых граніц ізраільскага ўраду не дазвалялі палесцінцам - жыхарам акупіраваных тэрыторый, уключаючы палесцінскіх рэлігійных лідэраў, а таксама ізраільцянам наведваць святыя месцы як у Ерусаліме, так і на Заходнім Беразе ракі Іардан.

**Іарданія**. Урад працягваў адмаўляць у прызнанні веравучэнняў друзаў і бахаістаў у якасці афіцыйных, хаця і не забараняў спавядаць гэтыя рэлігіі. Друзы падвяргаліся дыскрымінацыі ў дзяржаўных структурах, аднак не скардзіліся на сацыяльную дыскрымінацыю. Бахаісты падвяргаліся як дзяржаўнай, так і сацыяльнай дыскрымінацыі. Больш таго, паведамлялася, па меншай меры, аб 39 выпадках знаходжання ў Іарданіі дзяцей супраць волі іх матак - грамадзянак ЗША. Згодна з закананадаўствам ў выпадку, калі бацькі гэтых дзяцей – мусульмане, то і дзеці лічацца мусульманамі, а бацька-мусульманін мае права абмяжоўваць перамяшчэнне дзяцей.

**Малайзія**. Іслам з’яўляецца дзяржаўнай рэлігіяй і выспавяданне іншых плыняў ісламу, акрамя сунізму, значна абмяжоўвалася. Урад працягваў ажыццяўляць кантроль над дзейнасцю шыіцкай меншасці, пры гэтым перыядычна затрымліваліся члены груп, якія лічацца ісламскімі “адступніцкімі сектамі”, без суда і прад’яўлення абвінавачання. У цэлым, урад захоўваў права немусульман на выспавяданне сваіх рэлігій. Аднак органы дзяржаўнай улады пастаянна ажыццяўлялі кантроль будаўніцтва ўсіх немусульманскіх месцаў пакланення і выдзялення зямельных участкаў пад немусульманскія могілкі. Пасля выбараў, якія адбыліся ў лістападзе 1999 г., урад распачаў больш актыўныя намаганні, накіраваныя на абмежаванне дзейнасці ісламскай апазіцыі ў мячэцях. Некаторыя штаты аб’явілі аб увядзенні шэрагу мераў, уключаючы забарону на выступленні ў мячэцях некаторых імамаў, якія падтрымлівалі апазіцыю; больш актыўнае ўжыванне існуючых абмежаванняў на змест пропаведзяў, замена галоўных святароўі камітэтаў упраўлення мячэцяў, якія падтрымлівалі сувязі з апазіцыяй. Для мусульман, у асаблівасці этнічных малайцаў, права пераходу з ісламу ў іншую рэлігію з’яўляецца складаным пытаннем, і на практыцы было вельмі цяжка змяніць рэлігію.

**Малдова**. Урад працягваў дзейнічаць згодна з прынятымі раней рашэннямі аб адмаўленні ў рэгістрацыі некаторым групам. У якасці абгрунтавання рашэння аб адмаўленні ў рэгістрацыі гэтых груп прыводзіцца Артыкул 15 “Закону аб рэлігіі”, які забараняе здзяйсняць рэгістрацыю груп, азначаных ў ім, як “сектанцкія рухі” ў той ці іншай рэлігіі. У сепаратысцкім рэгіёне Прыднястровыя ўлады працягвалі адмаўляць шэрагу рэлігійных меншасцяў у рэгістрацыі і падвяргалі іх праследаванням.

**Расія**. Урад працягваў выкарыстоўваць шэраг палажэнняў прынятага ў 1997 г. "Закона аб свабодзе сумлення" з мэтай абмежавання свабоды веравызнання, у прыватнасці, палажэнне, якое дазваляе дзяржаве забараняць дзейнасць рэлігійных арганізацый, палажэнне аб перарэгістрацыі, працэдуры ліквідацыі і 15-гадовым цэнзе. Хаця федэральны ўрад імкнуўся забяспечыць у асноўным ліберальнае ўжыванне закону 1997 г., дзяржаўныя органы адмаўлялі ў выдачы і прадаўжэнні віз некаторым святарам і работнікам рэлігійных арганізацый, у асаблівасці рымскім католікам і хрысціянам-пратыстантам. Аб'яўленне аднаго з чатырох каталіцкіх епіскапаў персонай нон грата сур'ёзна абмежавала для расійскіх католікаў магчымасць спавядання рэлігіі. У многіх паведамленнях мясцовых чыноўнікаў і федэральную службу бяспекі абвінавачваюць ва ўвядзенні розных абмежаванняў і праследаваннях. Мусульмане, найбольш буйная рэлігійная меншасць, працягвалі сутыкацца з сацыяльнай дыскрымінацыяй і варожымі адносінамі ў многіх рэгёнах. Антысеміцкія лістоўкі, насценныя надпісы і артыкулы працягвалі з'яўляцца ў шэрагу гарадоў, такіх, як Санкт-Пецярбург, Разань і Краснадар. Паведамляецца, што ў шэрагу выпадкаў з-за варожых адносін "нетрадыцыйныя" рэлігійныя групы падвяргаліся праследаванням і нават фізічным нападзенням.

**Турцыя**. Нягледзячы на канстытуцыйныя гарантыі свабоды веравызнання, урад працягваў уводзіць абмежаванні на дзейнасць некаторых рэлігійных груп, у асноўным, шляхам выкарыстання іншых палажэнняў канстытуцыі, якія тычацца забеспячэння цэласнасці і існавання свецкай дзяржавы.

Акрамя таго, урад захаваў шэраг абмежаванняў, неабходных, па яго сцвярджэнню, для барацьбы з рэлігійным фундаменталізмам. Працягваліся актыўныя дыскусіі адносна ўведзенай ўрадам забароны на нашэнне мусульманскага рэлігійнага адзення ў дзяржаўных установах, уключаючы вышэйшыя навучальныя ўстановы, школы і працоўныя месцы. Некаторыя мусульмане, хрысціяне і бахаісты падвяргаліся праследаванням з боку ўладаў за місіянерскую дзейнасць і несанкцыяваныя сходы.

**Ганьба асобных канфесій шляхам іх неправамернага атаясамлення з небяспечнымі "культамі" альбо "сектамі"**

У Заходняй Еўропе захоўвалася тэндэнцыя да прыняцця дыскрымінацыйных законаў і правядзення палітыкі, накіраванай на ганьбу некаторых форм выяўлення рэлігійнай веры шляхам аднясення адпаведных канфесій да небяспечных "сект" ці "культаў". Іншыя краіны таксама прымаюць аналагічныя законы, часткова заснаваныя на законах, якія былі прыняты ў Заходняй Еўропе. У краінах, дзе атсутнічаюць традыцыі выканання правоў чалавека і забеспячэння вяршэнства закону, выкананне "антыкультавых" законаў можа лёгка прыняць такія формы, якія прывядуць да праследавання веруючых.

**Бельгія**. У выніку прыняцця мер, рэгулюючых дзейнасць рэлігійных "сект", у Бельгіі былі заснаваны дзяржаўныя агенцтвы па збору інфармацыі аб "небяспечных" арганізацыях. Відавочна, што існаванне гэтых агенцтваў сведчыць аб тым, што ўрад афіцыйна разглядае групы, аб якіх збіраюцца даныя, як на самой справе "небяспечныя" арганізацыі.

**Францыя**. Урад працягвае ажыццяўляць назіранне за дзейнасцю "сект" з дапамогай Міжведамаснай місіі па барацьбе з сектамі/культамі (MILS). Члены каля 173 груп, аднесеных да культаў, у дакладзе парламенцкай камісіі, якая была прадстаўлена ў 1996 г., паведамлялі аб выпадках праяўлення нецярпімасці, што мелі месца пасля абнародвання гэтых даных. Прыняты ў чэрвені 2001 г. "Закон Абу-Пікара" робіць больш жорсткімі абмежаванні ў адносінах да рэлігійных арганізацый і змяшчае

спіс відаў дзейнасці, за якія рэлігійная арганізацыя можа быць распушчана. Кіраўнікі чатырох асноўных рэлігій выказалі занепакоенасць у сувязі з прыняццем гэтага закону. Выказваюцца таксама апасенні ў сувязі з тым, што краіны з больш нізкім узроўнем аховы правоў чалавека, у тым ліку шэраг краін Усходняй Еўропы і Азіі, могуць выкарыстаць французскае заканадаўства ў якасці мадэлі, якая забяспечвае рэгуляванне дзейнасці рэлігійных меншасцяў, што пацвярждаецца праяўленнем цікавасці да французскага падыходу падчас падарожжа прадстаўнікоў MILS у гэтыя краіны.

**Германія**. Некаторыя фірмы і ўстановы пры найме на работу і/ці заключэнні кантрактаў выкарыстоўваюць "фільтры вызначэння прыналежнасці да сект", арыентаваных, у асноўным, на саенталогію. Гэта практыка спрыяе стварэнню атмасферы дыскрымінацыі і можа прыводзіць да фінансавых стратаў як кампаній, так і некаторых асоб.

## Раздзел II: Значнае паляпшэнне ў сферы выканання свабоды веравызнання

Адпаведна "Закону аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе" рэзюмэ дакладу павінна змяшчаць раздзел, у якім прыводзіцца спіс краін, у якіх заўважана "значнае паляпшэнне ў сферы аховы і развіцця" свабоды веравызнання; і змяшчаць апісанне характару паляпшэння, а таксама аналіз фактараў, якія дазволілі яго забяспечыць.

**Афганістан**. Падзенне рэжыму руху "Талібан" і далейшае заснаванне часовага ўраду прывяло да значнага паляпшэння сітуацыі з выкананнем свабоды веравызнання. Ультракансерватыўная ісламская дзяржаўная сістэма распалася пасля правядзення у кастрычніку 2001 г. аперацыі "Нязломная свабода". Зараз часовы адміністрацыйны савет ажыццяўляе ўпраўленне змяніўшым яе значна больш цярпімым рэжымам. Пры "Талібане" і створанай ім рэпрэсіўнай дзяржаўнай сістэме, заснаванай на экстрэмісцкай інтэрпрэтацыі ісламу, бязлітаснаму праследаванню

падвяргаліся ўсе тыя, хто спавядаў іншую веру, а таксама тыя, каго лічылі "недастаткова добрымі мусульманамі". Новы пераходны ўрад заявіў аб правядзенні палітыкі рэлігійнай цярпімасці. У грамадстве "пасля Талібана" існуючыя ў краіне рэлігійныя меншасці, такія, як шыіты, індуісты і сікхі, паведамляюць аб цярпімасці да іх прысутнасці і дзейнасці. Усе яны прадстаўлены ў Лойя Джырга. Шыіты прадстаўлены ва ўрадзе віцэ-прэзідэнтам і некалькімі міністрамі. Хутка канстытуцыйная камісія зоймецца падрыхтоўкай праекту новай канстытуцыі Афганістана, пры гэтым гарантыі свабоды веравызнання і роля ісламу ў дзяржаве застаюцца спрэчнымі пытаннямі, як для камісіі, так і для народа Афганістана.

**Іншыя краіны** прынялі шэраг пазітыўных мераў, накіраваных на выкананне свабоды веравызнання, аднак ніводная з іх не дасягнула ўзроўню "значнага паляпшэння" ў адпаведнасці з вызначэннем, якое змяшчаецца ў "Законе аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе". Чытач можа знайсці апісанне такіх пазітыўных крокаў у раздзелах прысвечаных адпаведным краінам.

## Раздзел III: Дзеянні, накіраваныя на выкананне права веравызнання ў краінах свету

Урэшце, найбольш эфектыўным метадам забеспячэння выканання свабоды веравызнання з'яўляецца прытрымліванне ўсеагульных прынцыпаў – у асаблівасці, забеспячэння недатыкальнасці годнасці чалавечай асобы – якія цвёрда выконваюцца там, дзе шануюць і абараняюць свабоду веравызнання. У многіх краінах свету нашы замежныя дыпламатычныя місіі знаходзяцца на пярэднім краі барацьбы за забеспячэнне права на свабоду веравызнання і супраць парушэнняў гэтага права. Не менш важным з'яўляецца тон і кантэкст выступленняў высокапастаўленых службовых асобаў ЗША, калі яны публічна выказваюцца па пытаннях свабоды веравызнання альбо абмяркоўваюць гэту тэму ў прыватных размовах з замежнымі кіраўнікамі ўрадаў ці палітычнымі дзеячамі.

**Справаздачны год**

Гэты раздзел змяшчае скарочанае апісанне шматлікіх намаганняў, якія рабілі Прэзідэнт і іншыя прадстаўнікі Ураду ЗША па забеспячэнню свабоды веравызнання. Большасць ініцыятыў, што называюцца ў дадзенай справаздачы, сведчаць аб пастаянным імкненні Ураду ЗША стымуляваць замежныя ўрады і народы да дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне свабоды веравызнання. Рэдка асобнае дзеянне бывае дастатковым для таго, каб выклікаць значную змену рэпрэсіўнай або дыскрымінацыйнай палітыкі, якой прытрымліваецца які-небудзь урад. Тым не менш, паслядоўная дзейнасць Ураду ЗША, накіраваная на развіццё свабоды веравызнання, ставіць мэтай забяспечыць усеагульную павагу і выкананне свабоды веравызнання.

Прэзідэнт Буш даў ясна зразумець, што ён разглядае свабоду веравызнання як асноўнае і неад'емнае права чалавека. Пры размовах з замежнымі лідэрамі ён неаднаразова падкрэсліваў, што Злучаныя Штаты надаюць асобае значэнне ахове гэтай асноватворнай свабоды. У сваім выступленні ў Пекіне ў лютым 2002 г., якое трансліравалася па ўсёй краіне, Прэзідэнт заявіў: "Свабоды веравызнання не варта палохацца, яе патрэбна прывітаць".

Дзяржаўны сакратар і многія высокапастаўленыя прадстаўнікі Дзяржаўнага дэпартаменту закраналі гэтую тэму падчас удзелу ў розных мерапрыемствах у многіх краінах свету. Прадстаўнікі Ураду ЗША ставілі пытанні па выкананню свабоды веравызнання на самым высокім урадавым узроўні, а таксама на міжнародных форумах, такіх , як "58-я сесія Камісіі па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый" у красавіку 2002 г., на якой ЗША падтрымалі рэзалюцыі па Ірану і выкананню свабоды веравызнання, уключаючы мандат спецыяльнага дакладчыка па пытаннях рэлігійнай свабоды. Галоўны памочнік Намесніка Дзяржсакратара па дэмакратыі, правах чалавека і працы выступіў з пераканаўчай прамовай на Пасяджэнні АБСЕ па рэалізацыі праграмы дзейнасці, у якой ён заклікаў дзяржавы-члены АБСЕ выконваць свабоду веравызнання. Памочнік

Дзяржаўнага сакратара па справах Еўропы і Еўразіі пацвердзіў пазіцыю ЗША ў пытанні аховы свабоды веравызнання падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Азербайджана ў лютым 2002 г.

Супрацоўнікі Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды Дзяржаўнага дэпартамента наведалі шэраг краін на працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, з мэтай абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання, уключаючы Азербайджан, Бангладэш, Боснію, Балгарыю, Кітай і Тыбет, Харватыю, Грузію, былую югаслаўскую рэспубліку Македонію, Мексіку, Расію, Турцыю і В'етнам. Начальнік Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды быў сустаршынёй дэлегацыі, якая прыняла ўдзел у Канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па свабодзе веравызнання і сярэдняй школьнай адукацыі, што адбылася ў Мадрыдзе ў лістападзе 2001 г.

"Закон аб міжнароднай рэлігійнай свабодзе" 1998 г. упаўнаважвае Прэзідэнта на прынятце мераў у выпадках асабліва грубых парушэнняў свабоды веравызнання. Так, у кастрычніку 2001 г. Дзяржаўны сакратар, які дзейнічаў на падставе паўнамоцтваў, атрыманых ад Прэзідэнта, перавёў пяць краін – Бірму, Кітай, Іран, Ірак і Судан – у катэгорыю "краін, якія выклікаюць найбольшую заклапочанасць" за здзяйсненне і дапушчэнне здзяйснення асабліва грубых парушэнняў у сферы рэлігійных свабод. Акрамя таго, Дзяржаўны сакратар уключыў Паўночную Карэю ў спіс "краін, якія выклікаюць найбольшую заклапочанасць" і зноў заявіў аб здзяйсненні рэжымам "Талібан" у Афганістане асабліва цяжкіх парушэнняў свабоды веравызнання.

Інфармацыя, змешчаная ў гэтым раздзеле, не з'яўляецца вычарпальнай. Пры складанні раздзела ставілася мэта прадставіць на наглядных прыкладах агульную карціну дзеянняў ЗША ў гэтай сферы. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці ў раздзелах, прысвечаных асобным краінам.

**Афганістан**. У кастрычніку 2001 г. Урад ЗША і сілы міжнароднай кааліцыі аб'ядналіся з сіламі Паўночнага альянсу з мэтай звяржэння рэжыму

"Талібан". Прадстаўнікі ЗША і міжнароднай супольнасці сумесна з прадстаўнікамі афганскай апазіцыі падрыхтавалі і ў снежні 2001 г. падпісалі Бонскае пагадненне. У наступныя месяцы прадстаўнікі ЗША пастаянна працавалі сумесна з часовай адміністрацыяй з мэтай забеспячэння выканання правоў чалавека і рэлігійнай і этнічнай цярпімасці. Яны займаліся такімі пытаннямі, як уключэнне прадстаўнікоў меншасці ў склад ураду і ўзброеных сіл ці аказанне дапамогі ў рэканструкцыі краіны і перабудове юрыдычнай і палітычнай сістэмы.
У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар ЗША назваў "Талібан", які захоўваў кантроль над Афганістанам да кастрычніка 2001 г., "асабліва небяспечным парушальнікам" свабоды веравызнання.

**Азербайджан**. Пасол неаднаразова інфармаваў Старшыню Дзяржаўнага камітэта па рабоце з рэлігійнымі аб'яднаннямі аб занепакоенасці ЗША адносна працэдуры рэгістрацыі і выказваў сур'ёзную заклапочанасць адпаведна выканання Азербайджанам абавязацельстваў па выкананню свабоды веравызнання іншымі членамі ўраду, а таксама апублікаваў гэту інфармацыю ў прэсе. Прадстаўнікі Пасольства таксама неаднаразова пратэставалі супраць арганізацыі ў сродках масавай інфармацыі кампаній супраць Адвенцісцкага агенцтва развіцця і дапамогі і іншых няўрадавых арганізацый, якія фінансуюцца ЗША і абвінавачваліся ў місіянерскай дзейнасці. Памочнік Дзяржаўнага сакратара па справах Еўропы і Еўразіі пацвердзіў пазіцыю ЗША ў пытанні па ахове свабоды веравызнання падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Азербайджана Гейдарам Аліевым ў студзені 2002 г. Прадстаўнік Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды Дзяржаўнага дэпартамента наведаў Азербайджан у красавіку 2002 г. з тым, каб праінфармаваць аб занепакоенасці Дэпартамента адпаведна працэдуры рэгістрацыі і арганізацыі ў сродках масавай інфармацыі кампаній супраць рэлігійных меншасцяў. Яна таксама правяла сустрэчы з прадстаўнікамі мусульманскай, яўрэйскай і хрысціянскай суполак з тым, каб выслухаць хвалюючыя іх праблемы.

**Бангладэш**. Пасольства прапанавала ўраду цераз Міністэрства па справах рэлігіі развіць і пашырыць сваю праграму навучання ісламскіх рэлігійных

лідэраў, якая ўключае навучанне для рэлігійных лідэраў па правах чалавека, ВІЧ/СНІД і пытаннях гендэрнай роўнасці. Прадстаўнік Аддзелу міжнароднай рэлігійнай свабоды Дзяржаўнага дэпартаменту наведаў у маі 2002 г. Бангладэш для апытання прадстаўнікоў рэлігійных меншасцяў, якія паведамлялі аб павялічэнні насілля супраць іх на працягу справаздачнага году.

**Беларусь**. Прадстаўнікі Пасольства падтрымлівалі рэгулярныя кантакты з кіраўнікамі і членамі рэлігійных груп, а таксама праводзілі сумесную работу з прадстаўнікамі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, накіраваную на забеспячэнне выканання свабоды веравызнання. Супрацоўнікі Дзяржаўнага дэпартаменту правялі шэраг сустрэч з прадстаўнікамі ўраду Беларусі ў Вашынгтоне, з мэтай абмеркавання пытанняў выканання свабоды веравызнання і іншых пытанняў, якія тычацца выканання правоў чалавека.

**Бірма**. Злучаныя Штаты спынілі аказанне двухбаковай дапамогі ўраду, прыпынілі выдачу ліцэнзій на экспарт зброі ў краіну, а таксама прыпынілі дзеянне агульнай сістэмы прэферэнцый і паслугі Экспартна-імпартнага банку па падтрымцы экспартных паставак ЗША ў краіну. Урад ЗША таксама прыпыніў фінасавыя паслугі Карпарыцыі прыватнага інвеставання за мяжой (КПІМ) па падтрымцы інвестыцый ЗША ў краіне; прыпыніў актыўнае садзейнічанне гандлю з краінай і адмяніла выдачу віз высокапастаўленым урадавым чыноўнікам і членам іх сем'яў. Урад таксама забараніў размяшчэнне новых інвестыцый у краіне фірмамі ЗША, выступіў супраць аказання любой дапамогі ўраду міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі і заклікаў урады іншых краін прыняць аналагічныя меры.
У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Бірму да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць".

**Кітай**. Урад ЗША прадпрымаў узгодненыя намаганні з мэтай пашырэння свабоды веравызнання ў краіне. Разам з тым былі зроблены мэтанакіраваныя дзеянні супраць парушэнняў і падтрыманы пазітыўныя тэндэнцыі ў краіне. У лютым 2002 г. Прэзідэнт Буш выступіў з прамовай ва

Універсітэце Цінхуа ў Пекіне, якая трансліравалася па ўсёй краіне і ў якой ён заклікаў урад праяўляць рэлігійную церпімасць. Супрацоўнікі пасольства і консульстваў ажыццяўлялі збор інфармацыі і падтрымлівалі кантакты з шырокім колам рэлігійных лідэраў рэлігійных суполак краіны, уключаючы епіскапаў, святароў, прапаведнікаў афіцыйна дзеючых хрысціянскіх цэркваў, а таксама кіраўнікоў таоісцкай, мусульманскай і будыйскай суполак. Прадстаўнікі Ўрада ЗША таксама правадзілі сустрэчы з кіраўнікамі і членамі незарэгістраваных хрысціянскіх цэркваў. Урад ЗША арганізаваў падарожжы шэрагу кітайскіх рэлігійных лідэраў і тэолагаў у Злучаныя Штаты ў рамках міжнародных праграм наведвання ЗША, падчас іх яны маглі ўбачыць, якую ролю адыгрывае рэлігія ў амерыканскім грамадстве. А таксама накіраваў шэраг экспертаў па рэлігійных пытаннях з ЗША для абмеркавання на тэму ролі рэлігіі ў грамадскім жыцці і дзяржаўнай палітыцы ЗША.

У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Кітай да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць".

**Грузія**. Высокапастаўленыя прадстаўнікі ураду ЗША, уключаючы Пасла, правялі сустрэчы з Прэзідэнтам Шэварднадзэ і іншымі высокапастаўленымі ўрадавымі чыноўнікамі, такімі, як спікер Парламента, міністры ўнутраных спраў і юстыцы. У ходзе іх была выказна занепакоенасць ураду ЗША ў сувязі з праследаваннямі і нападзеннямі на прадстаўнікоў нетрадыцыйных рэлігійных меншасцяў. У красавіку 2002 г. сенатар Гордан Сміт, член Камісіі ЗША па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, выступіў з рэзкай крытыкай беспакараных праследаванняў на рэлігійнай глебе ў Грузіі і заклікаў урад больш актыўна прыцягваць да суда экстрэмістаў, якія ажыццяўляюць напады на прадстаўнікоў нетрадыцыйных рэлігійных меншасцяў. Камісія таксама накіравала ліст, падпісаны 15 сенатарамі, у якім яна заклікала Шэварднадзэ спыніць насілле супраць груп рэлігійных меншасцяў у Грузіі. Прадстаўнік Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды Дзяржаўнага дэпартаменту, які наведаў краіну ў красавіку 2002 г., правёў сустрэчы з членамі ўрада, прадстаўнікамі розных рэлігійных канфесій і неўрадавымі арганізацыямі, на якіх ён падкрэсліў

неабходнасць прыняцця ўрадам Грузіі мераў, што палажылі б канец насіллю на рэлігійнай глебе.

**Індыя**. У сувязі з ажыццяўленнем актаў міжканфесіянальнага насілля ў Гуджраце, Пасол і іншыя высокапастаўленыя прадстаўнікі Адміністрацыі выказалі і перадалі свае спачуванні ахвярам насілля, а таксама заклікалі ўсе бакі да вырашэння рознагалоссяў мірным шляхам. Акрамя таго, місія Агенцтва ЗША па міжнароднаму развіццю (USAID) ў Нью Дэлі выдзяліла фінансавыя сродкі для аказання дапамогі перамешчаным асобам у Гуджараце. Генеральны консул у Мумбаі неаднаразова наведваў Ахмедабад, буйнейшы горад штата Гуджарат, дзе сустракаўся з афіцыйнымі і прыватнымі асобамі з мэтай высвятлення прычын і наступстваў насілля. У сувязі з прадаўжэннем масавых беспарадкаў іншыя супрацоўнікі Генеральнага консульства ў Мумбаі таксама ажыццяўлялі паездкі ў штат з мэтай ацэнкі сітуацыі і расследавання абвінавачанняў у парушэнні правоў чалавека. Супрацоўнікі консульства падчас ажыццяўлення маніторынгу наступстваў насілля ў Гуджараце таксама правялі шэраг сустрэч у Мумбаі з прадстаўнікамі неўрадавых арганізацый, дзелавых колаў, сродкаў масавай інфармацыі, уключаючы мусульманскіх лідэраў.

**Інданэзія**. Супрацоўнікі Пасольства і Генеральнага консульства ЗША вызначылі некалькі грамадзян Інданэзіі і забяспечылі іх магчымасцю даць паказанні па выкананню свабоды веравызнання перад Камісіяй ЗША па выкананню свабоды веравызнання(USCIRF), а таксама праводзілі кансультацыі з USCIRF па патэнцыяльных праблемах. Пасольства ЗША і Амерыкана-інданэзійскі фонд Фулбрайта аказваюць дапамогу ў арганізацыі першага ў краіне курса параўнальной рэлігіі на ўзроўні аспірантуры з мэтай павышэння ўзроўню рэлігійнага навучання, а таксама развіцця ўзаемаразумення паміж прадстаўнікамі розных канфесій у каледжах і універсітэтах. USAID таксама працягвае аказваць падтрымку дзесяткам рэлігійных няўрадавых арганізацый з мэтай садзейнічання развіццю дэмакратычнага руху ў мусульманскай суполцы.

**Іран**. Штогод у перыяд з 1982 па 2001 гг. Урад ЗША з'яўляўся сааўтарам рэзалюцыі па сітуацыі з правамі чалавека ў Іране, якая ўносілася Еўрапейскім Саюзам на штогадовым пасяджэнні Камісіі ААН па правах чалавека. Злучаныя Штаты падтрымлівалі аналагічную рэзалюцыю, якая ўносілася штогод на працягу гэтага перыяду на пасяджэннях Генеральнай Асамблеі ААН. Урад ЗША падтрымліваў дзейнасць Спецыяльнага прадстаўніка ААН па правах чалавека па Ірану і заклікаў іранскі ўрад дазволіць яму ўезд у краіну для правядзення неабходных даследаванняў.
У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Іран да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць".

**Ірак**. Палітыка ЗША ў адносінах да Ірака заключаецца ў садзейнічанні змене правячага рэжыму гэтай краіны. Урад ЗША заявіў аб сваёй пазіцыі ў гэтым пытанні як публічна, так і пры дыплыматычных кантактах з іншымі дзяржавамі. Прэзідэнт закранаў праблемы, з якімі сутыкаюцца шыіты, хрысціяне і іншыя рэлігійныя групы, у сваіх перыядычных дакладах Кангрэсу аб сітуацыі ў Іраку. Памочнік Дзяржаўнага сакратара па справах Блізкага Усходу, выступаючы перад Кангрэсам, напершы план высунуў аб становішчы насельніцтва на поўдні краіны.
У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Ірак да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць".

**Кенія**. Прадстаўнікі Ўраду ЗША рабілі мэтанакіраваныя намаганні з мэтай устанаўлення ўзаемаразумення паміж мусульманамі і хрысціянамі. Пасол праводзіў рэгулярныя сустрэчы з рэлігійнымі лідэрамі, на якіх абмяркоўваліся пытанні, закранаючыя інтарэсы іх суполак. У красавіку 2002 г. Пасол і высокапастаўленыя прадстаўнікі пасольства наведалі Момбасу для правядзення сустрэч з прадстаўнікамі грамадства, рэлігійнымі лідэрамі і дзяржаўнымі дзеячамі ў мусульманскім рэгіёне прыбрэжнай зоны з мэтай растлумачэння палітыкі ЗША, на якіх ён запэўніў удзельнікаў сустрэчы, што глабальная вайна супраць тэрарызму не накіравана супраць ісламу.

**Лаос**. Пасол абмяркоўваў сітуацыю па выкананню свабоды веравызнання непасрэдна з Прэзідэнтам і іншымі высокапастаўленымі чыноўнікамі. Іншыя супрацоўнікі пасольства таксама закраналі пытанні выканання свабоды веравызнання пры правядзенні сустрэч з шэрагам службовых асоб з цэнтральных і мясцовых органаў улад. У студзені 2002 г. Пасольства падтрымала і забяспечыла правядзенне візіту прэзідэнта Інстытута глабальнага дзеяння (ІГД) для вывучэння сітуацыі са свабодай веравызнання. Падчас візіту, Прэзідэнт ІГД наведаў суполкі лаоскай евангельскай царквы ў паўночнай правінцыі Вьенцьян. У выніку візіту, у гэтым раёне былі зноў адкрыты некалькі цэркваў, якія раней былі закрыты мясцовымі ўладамі. У чэрвені 2002 г. па запрашэнню ІГД дэлегацыя "Лаоскага фронту нацыянальнага будаўніцтва", арганізацыі, адказнай за нагляд у рэлігійнай сферы, наведала ЗША для абмеркавання пытанняў выканання свабоды веравызнання ў Лаосе з удзелам прадстаўнікоў Урада ЗША, членаў Кангрэса і іншых асоб, зацікаўленых у гэтым пытанні.

**Мексіка**. Прадстаўнікі Ўрада ЗША  заклікалі да працягу палітыкі, накіраванай на забеспячэнне выканання свабоды веравызнання. Супрацоўнікі пасольства прынялі ўдзел у святкаванні ў лістападзе 2001 г. Міжнароднага дня цярпімасці, арганізаваным Сакратарыятам Урада і правялі шэраг сустрэч у Падсакратарыяце па справах рэлігіі, на якіх абмяркоўваліся пытанні выканання свабоды веравызнання. У красавіку 2002 г. прадстаўнік Аддзела па міжнароднай рэлігійнай свабодзе сумесна з супрацоўнікамі пасольства правёў шэраг сустрэч з рэлігійнымі лідэрамі і дзяржаўнымі чыноўнікамі ў г. Мехіка і штаце Ч'япас, у тым ліку з дзеючым і ранейшым епіскапамі Сан Крытсобаль дэ лас Касас і прадстаўнікамі ўладаў штата Ч'япас.

**Нігерыя**. Урад ЗША праз Пасольства ЗША і заяўленнях афіцыйных асобаў у Вашынгтоне працягваў падтрымліваць мірнае ўрэгуляванне праблемы ўжывання законаў шарыяту і заклікаць да выканання правоў чалавека і свабоды веравызнання. Аддзел ініцыятыў пераходнага перыяду сумесна з USAID таксама падрыхтавалі праграмы навучання метадам урэгулявання канфліктаў. Пасольства арганізавала візіт выканаўчага дырэктара

Амерыканскага мусульманскага савету з мэтай абмеркавання пытанняў выканання свабоды веравызнання ў Злучаных Штатах з прадстаўнікамі мусульманскай і хрысціянскай суполак у Абуджы, Лагосе і шэрагу гарадоў на поўначы краіны.

**Паўночная Карэя**. Палітыка ЗША змяшчае падтрымку развіцця свабоды веравызнання ў краіне. Аднак ЗША не маюць дыпламатычных адносінаў з Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай Карэя і таксама не маюць тут афіцыйных прадстаўніцтваў. Палітыка ЗША дазваляе грамадзянам Злучаных Штатаў наведваць гэту краіну, і шэраг цэркваў і рэлігійных груп, арганізавалі акцыі, накіраваных на змяншэнне пакутаў, выкліканых недахопам прадуктаў харчавання і лекаў.

У 2001 г. Дзяржаўны сакратар залічыў Паўночную Карэю да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць" – гэта першы год уключэння краіны ў гэту катэгорыю.

**Расія**. У маі 2002 г. Прэзідэнт Буш, Першая Лэдзі Лаўра Буш і Дзяржаўны сакратар Колін Паўэл сустрэліся з рэлігійнымі дзеячамі розных веравызнанняў у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Пасол закрануў тэму свабоды веравызнання ў ходзе сустрэч з прадстаўнікамі яўрэйскай суполкі па розных пытаннях, уключаючы Рош а-шана, а таксама ў звароце да членаў мусульманскай суполкі па выпадку заканчэння месяца рамадан на сустрэчы, арганізаванай Саветам муфціяў. Таксама Пасол гаварыў аб важнасці выканання свабоды веравызнання ў сваім выступленні на канферэнцыі ў Цэнтры Сахарава ў красавіку 2002 г. Прадметам шматлікіх кансультацый на высокім узроўні паміж прадстаўнікамі выканаўчай галіны ўраду ЗША і ўраду Расіі, у якіх прынялі ўдзел шэраг высокапастаўленых чыноўнікаў ЗША, стаў "Закон аб свабодзе сумлення" 1997 г. У красавіку 2002 г. прадстаўнік Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды правяла сустрэчы з многімі дзяржаўнымі чыноўнікамі і прадстаўнікамі асноўных рэлігій, на якіх яна падкрэслівала важнасць выканання правоў рэлігійных меншасцяў.

**Судан**. Урад ЗША інфармаваў урад гэтай краіны аб тым, што праблема свабоды веравызнання з'яўляецца адной з галоўных перашкод для развіцця пазітыўных адносін паміж Суданам і Злучанымі Штатамі. Пасольства і Дзяржаўны дэпартамент настойліва паднімалі пытанні выканання свабоды веравызнання ў публічных заяўленнях у прэсе і на міжнародных форумах, у тым ліку ў Камісіі ААН па правах чалавека. Спецыяльны пасланнік па мірнаму ўрэгуляванню ў Судане Джон Дэнфарт настойваў на прыняцці мераў па выкананню свабоды веравызнання і прыняў удзел у шэрагу сустрэч з рознымі рэлігійнымі лідэрамі падчас візітаў у Судан. Урад ЗША падтрымаў правядзенне мірных перамоў пад эгідай Міжўрадавай камісіі па развіццю. (У ліпені 2002 г., хутка пасля заканчэння перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, у выніку мірных перамоў быў падпісаны Мачакоскій Пратакол, у якім бакі заяўляюць аб дасягненні пагаднення аб тым, што заканадаўства, прынятае нацыянальным урадам, якое тычыцца паўднёвых раёнаў, не будзе аснавана на прынцыпах шарыяту). Урад ЗША таксама выступіў ініцыятарам расследавання Міжнароднай групай вядомых асоб выпадкаў рабства, выкраданняў і прымусовай працы ў краіне.

У 2001 г. – трэці год запар – Дзяржаўны сакратар залічыў Судан да катэгорыі "краін, якія выклікаюць асобую занепакоенасць".

**Таджыкістан**. Выкарыстоўваючы сродкі народнай дыпламатыі, Пасольства ЗША падтрымлівала праграмы, якія дазвалялі лепей зразумець адносіны дэмакратый да свецкіх прынцыпаў арганізацыі грамадства і пытанняў выканання свабоды веравызнання. Шэраг удзельнікаў гэтых праграм паведамляў аб тым, што ўдзел у іх дазволіў ім лепей зразумець ролю, якую адыгрывае рэлігія ў адкрытым грамадстве. У Вашынгтоне прадстаўнікі Аддзела міжнароднай рэлігійнай свабоды і Ураду ЗША правялі шэраг сустрэч з мэтай абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання з групамі ўдзельнікаў праграм наведвання ЗША, што фінансуюцца урадам ЗША. На сустрэчах прысутнічалі журналісты, рэлігійныя дзеячы, вучоныя і дзяржаўныя чыноўнікі.

**Турцыя**. У снежні 2001 г. Дзяржаўны сакратар правёў шэраг сустрэч з высокапастаўленымі ўрадавымі чыноўнікамі, на якіх былі абмеркаваны пытанні, што ўключалі выкананне свабоды веравызнання. Прадстаўнікі Бюро па дэмакратыі, правах чалавека і працы, якія наведалі краіну ў красавіку і маі 2002 г., сустрэліся з членамі розных рэлігійных груп, якія паведамілі аб існуючых праблемах. Пасол і іншыя супрацоўнікі пасольства працягваюць падтрымліваць цесныя кантакты з мясцовымі няўрадавымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць маніторынг выканання свабоды веравызнання. Пасольства ЗША працягвае кантакты з урадам адносна ўзнаўлення дзейнасці раней закрытай семінарыі Халкі на востраве Хэйбэлі.

**В'етнам**. Пасол ЗША і супрацоўнікі пасольства неаднаразова паднімалі пытанні выканання свабоды веравызнання на сустрэчах з урадавымі чыноўнікамі, уключаючы прэм'ер-міністра, міністра замежных спраў і іншых высокапастаўленых асобаў урада і камуністычнай партыі. Яны інфармавалі іх аб тым, што ад вырашэння рэлігійных праблем і забеспячэння выканання правоў чалавека будзе залежыць ступень нармалізацыі двухбаковых адносін. Прадстаўнікі місіі ЗША заклікалі ўрад вызваліць Ціх Куанг До ад адбывання ўмоўна-адміністрацыйнага пакарання і перавесці Ціх Хуен Куанга ў Хо Шы Мін па прычынах гуманітарнага характару. Яны таксама выказалі занепакоенасць у сувязі з турэмным зняволеннем бацькі Нгуен Ван Лі, адзначалі надзвычайную строгасць вынесенага яму прыгавора і заклікалі да яго датэрміновага вызвалення. Дэлегацыя, якую ўзначальваў Памочнік Дзяржаўнага сакратара па пытаннях дэмакратыі, правах чалавека і працы ў жніўні 2001 г. правяла з урадам дыялог аб правах чалавека, у ходзе якога абмяркоўвалася становішча Ціх Куан До, Ціх Хуен Куанга, Аб'яднанай будысцкай царквы, пратэстантаў племяні Хмонг, пратэстантаў, якія пражываюць на Цэнтральным узвышшы, Ле Куанг Ліема і каталіцкай царквы. Некаторыя рэлігійныя крыніцы лічаць, што дыпламатычнае ўмяшанне, галоўным чынам, з боку ЗША з'яўляецца прычынай таго, што ўрад мае намер легалізаваць большую колькасць рэлігійных груп і забяспечыць большай свабодай ужо легалізаваныя групы.

**Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.: Беларусь**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ДЭПАРТАМЕНТ ЗША**

**Беларусь**

Даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2002 г.
Выдадзены Бюро па пытаннях дэмакратыі, правах чалавека і працы

Канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання, аднак рэжым абмяжоўвае ажыццяўленне гэтага права на практыцы.

Становішча з выкананнем права веравызнання заставалася крайне нездавальняючым на працягу перыяду, які ахоплівае дазеная даклад. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка працягваў праводзіць палітыку апякання Рускай праваслаўнай царквы, рэлігіі большасці насельніцтва краіны, у той час, як улады працягвалі прыгнечанне іншых канфесій і рэлігій. Рэжым неаднаразова адмаўляў у рэгістрацыі многім з іх, уключаючы Беларускую праваслаўную аўтакефальную царкву (БПАЦ) і некаторыя ўсходнія рэлігіі.

Без рэгістрацыі многім з гэтых груп цяжка альбо зусім немагчыма арэндаваць ці набыць уласнасць для правядзення набажэнстваў. Улады працягваюць ужываць прыняты ў 1995 г. указ Кабінету міністраў, які абмяжоўвае дзейнасць членаў рэлігійных арганізацый з мэтай аховы Рускай праваслаўнай царквы і прадухілення распаўсюджвання іншых рэлігій. На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, пратэстанцкія і іншыя неправаслаўныя рэлігійныя групы працягвалі падвяргацца нападам у дзяржаўных сродках масавай інфармацыі. Нягледзячы на прадаўжэнне праследаванняў, некаторым рэлігійным меншасцям, калі яны паводзілі сябе дастаткова незаўважальна, удавалася ажыццяўляць рэлігійную дзейнасць. 27 чэрвеня ніжняя палата парламенту адобрыла новы закон аб

рэлігіі, які змяшчае новыя жорсткія абмежаванні на свабоду веравызнання. Нягледзячы на спробы выканаўчай улады забяспечыць хуткае прынясце закону, верхняя палата адклала яго разгляданне да восені 2002 г.

У асноўным, сярод зарэгістраваных традыцыйных рэлігійных суполак існуюць дружалюбныя адносіны, аднак, на бытовым узроўні захоўваўся антысемітызм і працягвалі ўзмацняцца крытычныя адносіны да рэлігійных меншасцяў.

Урад ЗША абмяркоўваў з прадстаўнікамі рэжыму нездавальняючую сітуацыю з правамі чалавека ў краіне, а таксама ўздымаў пытанні выканання свабоды веравызнання. Супрацоўнікі Пасольства ЗША в Мінску таксама абмеркавалі шэраг канкрэтных пытанняў з прадстаўнікамі ўраду, і ў чэрвені 2002 г. Пасольства ЗША ў Мінску публічна заклікала ўлады забяспечыць прынясце такога праекту закону аб рэлігіі, які б гарантаваў права беларускіх грамадзян на свабоднае веравызнанне.

## Раздзел I. Рэлігійная дэмаграфія

Плошча краіны складае 76810 кв. міляў, насельніцтва складае прыблізна 9990000 чалавек.

Пастаяннае падаўленне на працягу апошніх двух стагоддзяў грэка-каталіцкай царквы, якая калісьці была рэлігіяй большасці насельніцтва, пры расійскай і савецкай імперыях, праследаванне рымска-каталіцкай царквы на працягу гэтага ж перыяду, і рэпрэсіі савецкіх уладаў супраць большасці святароў Рускай праваслаўнай царквы значна змянілі рэлігійны ландшафт і пераўтварылі праваслаўную царкву, якая ўзначальваецца Маскоўскай Патрыярхіяй, у царкву большасці насельніцтва краіны. Больш таго, падаўленне рэлігіі на працягу сямі дзесяцігоддзяў савецкім рэжымам спрыяла фарміраванню культуры, якая ў асноўным з'яўлялася свецкай. У 1998 г. па даных апытання грамадскай думкі менш за палову насельніцтва верыла ў бога. У той жа час, каля 60% апытаных залічалі сябе па

прычынах культурнага ці гістарычнага характару да Рускай праваслаўнай царквы. Дзяржаўны орган, адказны за рэгуляванне рэлігійнай дзейнасці, заснаваны ў 1997 г. як Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і пераўтвораны ў верасні 2001 г. у Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савета міністраў (КСРН) пацвярджае, што каля 80% усіх веруючых належаць да рускай праваслаўнай царквы. Ад 15% да 20% усіх веруючых альбо з'яўляюцца каталікамі, якія наведваюць богаслужэнні, альбо залічаюць сябе да Рымска-каталіцкай царквы (другой па колькасці рэлігійнай групы). Ад 50000 да 90000 чалавек лічаць сябе яўрэямі. Існуюць таксама групы пратэстантаў, а таксама вернікаў, якія належаць да Грэка-каталіцкай царквы і Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Іншыя рэлігійныя меншасці уключаюць Адвенцістаў Сёмага Дня, стараверцаў, мусульман (Вярхоўная адміністрацыя мусульман, ліквідаваная ў 1939 г., была адноўлена ў пачатку 1994 г.), Сведкаў Іегавы, апостальскіх хрысціян, кальвіністаў і лютэран. Невялікая суполка этнічных татар, карані якой зыходзяць у 11 стагоддзе, спавядае іслам.

У 1989 г., калі краіна стала экзархатам Рускай праваслаўнай царквы, узнікла Беларуская праваслаўная царква. Патрыяршы экзарх Філарэт узначальвае праваслаўную суполку з 1978 г. Пад кіраўніцтвам Філарэта колькасць праваслаўных прыходаў у краіне павялічылася да 1 260 да канца перыяду, які ахоплівае дазеная даклад.

Беларусь, якая знаходзіцца паміж Польшчай і Расіяй, гістарычна была як месцам узаемадзеяння, так і арэнай саперніцтва і канфліктаў паміж рускім праваслаўем і рымскім каталіцызмам. Кардынал Казімеж Свёнтэк, архіепіскап Мінска-Магілёўскай епархіі, узначальвае каля 400 каталіцкіх прыходаў. Традыцыйна рымска-каталіцкая суполка была больш шматлікай у раёнах, якія знаходзіліся пад уплывам Польшчы, аднак не ўсе члены этнічнай польскай суполкі, якая налічвае 400000 чалавек, належаць да Рымска-каталіцкай царквы. Хаця рымска-каталіцкія прыходы размешчаны ў розных рэгіёнах краіны, большасць католікаў жывуць у раёнах, якія знаходзяцца на захадзе і поўначы краіны і мяжуюць з Польшчай і Літвой. Іх

больш высокая канцэнтрацыя ў гэтых раёнах часткова растлумачваецца тым, што ў перыяд існавання Расійскай імперыі і ў савецкія часы Рымска-каталіцкая царква больш актыўна падаўлялася ва ўсходніх рэгіёнах. Кардынал Свёнтэк, які сам правёў 10 гадоў у савецкіх лагерах, усведамляе небяспеку дачынення да рымска-каталіцкай царквы, як да "замежнай" альбо царквы, якая прадстаўляе палітычную пагрозу, таму стараецца не ўцягваць царкву ва ўнутраныя палітычныя праблемы. Хаця кардынал забараніў выкарыстанне ў цэрквах польскіх нацыянальных сімвалаў і падтрымлівае выкарыстанне беларускай, а не польскай мовы падчас правядзення царкоўных богаслужэнняў, некаторыя святары працягваюць праводзіць богаслужэнні на польскай мове.

Па наяўных даных каля 120 тысяч грамадзян лічыліся грамадзянамі "яўрэйскай нацыянальнасці" напрыканцы савецкага перыяду ў 1989 г., у параўнанні з іх колькасцю, якая складала ад 50000 да 90000 чалавек у перыяд, які ахоплівае дазеная даклад. Амаль палова гэтага яўрэйскага насельніцтва жыве ў Мінску альбо ў яго наваколлі. У красавіку 2002 г. у Мінску адкрыўся "Яўрэйскі грамадскі цэнтр", які фінансуецца Амерыкансім камітэтам сумеснага размеркавання. Большасць яўрэяў, што жывуць у краіне, не займаюцца актыўным веравызнаннем рэлігіі. Большая частка з тых, хто займаецца актыўным веравызнаннем, належыць, па ўсёй бачнасці, да рэфармісцкіх ці кансэрватыўных груп. У Мінску знаходзіцца невялікая, але актыўна дзеючая артадаксальная сінагога Любавічаў.

Хаця вернікі-пратэстанты і прадстаўляюць невялікую частку насельніцтва, іх колькасць працягвае павялічвацца. Па даных дзяржаўных і незалежных крыніц, за перыяд з 1999 г. колькасць зарэгістраваных і незарэгістраваных пратэстанцкіх кангрэгацый больш чым падвоілася, і зараз складае больш 1000. Пратэстанцкія рэлігіі, якія з-за гістарычных прычын заўсёды былі значна меншымі па колькасці за праваслаўныя, дзейнічаюць у краіне на працягу некалькіх стагоддзяў. У савецкі перыяд шэраг пратэстанцкіх цэркваў быў адміністратыўна-прымусова далучаны да царкоўнай арганізацыі пяцідзесятнікаў-баптыстаў. Дзве буйнейшыя пратэстанцкія групы зарэгістраваны асобна як аб’яднанні пяцідзесятнікаў і баптыстаў.

Значная колькасць пратэстанцкіх цэркваў, уключаючы харызматычныя групы і групы пяцідзесятнікаў, застаюцца незарэгістраванымі.

У краіне ёсць таксама шэраг іншых кангрэгацый, такіх, як Грэка-каталіцкая царква, якая калісьці была рэлігіяй большасці насельніцтва. Грэка-каталіцкая царква была заснавана ў XVI стагоддзі і калісьці яе прыхільнікі складалі тры чвэрці насельніцтва краіны. Яна была забаронена рускім урадам у 1839 г. і падвяргалася бязлітасным праследаванням у 1860-я гг., а затым у 1946 г. Пасля аднаўлення незалежнасці Беларусі ў 1991 г. спробы адрадзіць гэту царкву, якая выкарыстоўвае праваслаўныя абрады, але падначалена Ватыкану, не мелі значнага поспеху.

## Раздзел II. Становішча ў сферы свабоды веравызнання

*Юрыдычныя/палітычныя умовы*

Канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання; аднак рэжым, які існуе ў краіне, абмяжоўвае ажыццяўленне гэтага права на практыцы. Хаця Артыкул 16 Канстытуцыі з папраўкамі 1996 г., прыняты пасля правядзення незаконнага рэферэндуму, які Лукашэнка выкарыстаў для пашырэння сваіх паўнамоцтваў, пацвярджае прынцып роўнасці рэлігій і дэнамінацый перад законам, ён таксама змяшчае абмежаваныя палажэнні, якія прадугледжваюць, што адносіны паміж дзяржавай і рэлігіямі "рэгулюецца законам з улікам іх уплыву на духоўныя, культурныя і гістарычныя традыцыі беларускага народа".

У краіне не маецца дзяржаўнай рэлігіі. З часу свайго абрання на пасаду прэзідэнта краіны ў 1994 г. Лукашэнка, які называе сябе "праваслаўным атэістам", праводзіць палітыку апякання Рускай праваслаўнай царквы, як пануючай рэлігіі краіны і прыгнечання іншых сект і канфесій, якія не належаць Рускай праваслаўнай царкве. У чэрвені 2001 г. падчас сустрэчы з Алексіем II, Патрыярхам Маскоўскім, Лукашэнка заявіў, што "па сутнасці, праваслаўе з'яўляецца асновай нашай дзяржавы".

У асноўным улады разглядаюць рускае праваслаўе, а таксама рымска-каталіцкую царкву, іўдаізм, іслам і евангельска-лютэранскую царкву, як "традыцыйныя" рэлігіі. Іншыя рэлігіі разглядаюцца імі як "нетрадыцыйныя", а некаторыя з іх, такія, як шэраг усходніх рэлігій, лічацца "сектамі". Хаця пратэстанцкія групы адносяць да катэгорыі нетрадыцыйных рэлігій, некаторыя з іх лічацца сектамі. Улады адмаўляюць у дзяржаўнай рэгістрацыі некаторым рэлігіям, якія лічацца нетрадыцыйнымі, і ўсім канфесіям, якія прызнаны сектамі.

Па даных КСРН у краіне афіцыйна зарэгістраваны 26 рэлігійных канфесій; аднак невядома, наколькі гэта лічба адлюстроўвае рэальнае становішча. Некаторыя кангрэгацыі зарэгістраваны толькі на мясцовым узроўні, што забяспечвае іх абмежаванымі правамі. Толькі кангрэгацыі, зарэгістраваныя цэнтральнымі дзяржаўнымі органамі, маюць права запрашаць замежных дзеячаў і адкрываць новыя цэрквы. Хаця ўсе зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі вызваляюцца ад выплаты падаткаў, па ўсёй бачнасці, дзяржаўныя субсідыі выдзяляюцца толькі праваслаўнай царкве. Ад дзяржаўных служачых не патрабуюць аніякай рэлігійнай клятвы ці выканання абрадаў якой-небудзь рэлігіі.

Прэзідэнцкім Указам № 516 ад 24 верасня 2001 г. Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пераўтвораны ў камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў (КСРН).

Па прыкладу Аляксандра Лукашэнкі, улады праводзяць палітыку апякання Рускай праваслаўнай царквы як пануючай рэлігіі краіны і прыцяснення іншых дэнамінацый і канфесій, якія ёй не належаць. У свім звароце па выпадку свята Пасхі ў красавіку 2002 г., Лукашэнка сказаў, што “дзяржава заўсёды стаяла і будзе стаяць поруч царквы, якая нясе дабро людзям”. Прэм’ер-міністр Генадзь Навіцкі заявіў: “Дзяржава робіць усё, што здольна, для аказання дапамогі ў рэстаўрацыі і будаўніцтве цэркваў”, і дадаў, што “дзякуючы пастаянным намаганням царквы, значна вырас аўтарытэт [царквы] у краіне”. Улады падтрымліваюць пашырэнне ўплыву Рускай

праваслаўнай царквы ў рамках агульнай стратэгіі, накіраванай на ўзмацненне "славянскага адзінства" ў рэгіёне і забеспячэння далейшага палітычнага аб'яднання паміж Беларуссю і Расіяй. Лукашэнка, надзяліўшы Рускую праваслаўную царкву асобымі прывілеямі, якіх не маюць іншыя дэнамінацыі, абвясціў захаванне і развіццё рускага праваслаўнага хрысціянства "маральным абавязкам". У маі 2002 г. урад выдзяліў каля 570000 долараў ЗША (1 мільярд рублёў) на будаўніцтва праваслаўнай царквы ў Магілёве. 18-20 сакавіка адбыўся пяты візіт Патрыярха Рускай праваслаўнай царквы Алексія II, падчас якога ён адкрыў Дом міласэрнасці. Дом міласэрнасці, які фінансуецца за кошт выдзяляемых праваслаўнай царквой сродкаў і замежных ахвяраванняў, створаны для аказання дапамогі інвалідам, цяжка хворым і немаёмасным грамадзянам. Падчас знаходжання ў Мінску Алексій II уручыў Лукашэнку царкоўную ўзнагароду за яго намаганні па аб'яднанню славянскіх народаў. Раней, пасля таго як у студзені 2001 г. на карысць рускай праваслаўнай царквы было зроблена ахвяраванне ў памеры 100000 долараў, Алексій II уручыў Лукашэнку ордэн за ўклад у справу адзінства славянскіх народаў за яго намаганні па абароне рускага праваслаўя.

У адпаведнасці з палажэннем, выдадзеным у сакавіку 2001 г., рэжым дазваляе накіроўваць запрашэнні, неабходныя для атрымання віз, прадстаўнікам замежных рэлігійных арганізацый толькі па ўзгадненню з КСРН нават у тых выпадках, калі мэтай візіту з'яўляецца не рэлігійная, а, напрыклад, дабрачынная дзейнасць. Арганізацыя, якая запрашае, павінна прадставіць заяву аб запрашэнні замежнага святара ў пісьмовай форме, дзе павінны быць вызначаны тэрміны і мэта запрашэння. Тэрмін разглядання КСРН заявы складае 20 дзён, пры гэтым не прадугледжана працэдура абскарджання рашэння КСРН. У красавіку 2001 г. рэжым увёў папраўкі ў грамадзянскі кодэкс з мэтай абмежавання падрыўной дзейнасці замежных арганізацый у краіне. Новы пункт кодэксу забараняе заснаванне прадстаўніцтваў замежных арганізацый, "дзейнасць якіх накіравана на ... распальванне нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, а таксама дзейнасці, якая можа аказваць адмоўнае ўздзеянне на фізічнае і псіхічнае здароўе грамадзян".

**Абмежаванні свабоды веравызнання**

27 чэрвеня 2002 г. ніжняя палата парламенту канчаткова адобрыла новы закон аб рэлігіі. Нягледзячы на спробы выканаўчай улады, якія мелі месца, забяспечыць хуткае прыняцце закону, верхняя палата адклала яго разгляданне да восені. Праект закону змяшчаў шэраг палажэнняў, якія многія рэлігійныя групы лічаць надзвычай абмежавальнымі і якія могуць у далейшым быць выкарыстаны для перашкоджання і магчымага недапушчэння дзейнасці евангельскіх хрысціян і іншых рэлігійных груп. Законапраект быў падрыхтаваны часткова ў адказ на звароты Рускай хрысціянскай царквы; на публічнай сустрэчы з членамі парламенцкай камісіі па правах чалавека, якая адбылася ў маі 2001 г., праваслаўны Архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Максім публічна заклікаў прыняць новы закон аб рэлігіі, які б абараніў "пануючае" палажэнне Рускай праваслаўнай царквы ў краіне; ўвесці ў сярэдніх школах рэлігійнае навучанне і забараніць распаўсюджванне нетрадыцыйных рэлігій. Валеры Ліпкін, старшыня камітэту, заявіў, што прапанаваны новы закон забароніць распаўсюджванне "дэструктыўных сект" у краіне.

Да і падчас абмеркавання праекту закону аб рэлігіі, якое адбылося ў чэрвені 2002 г., шэраг дэпутатаў ніжняй палаты парламенту рабілі заяўленні, заснаваныя на ксенафобіі і антысемітызме. Дэпутат Сяргей Касьян заявіў, што прыняцце законапраекту было неабходным для таго, каб "паставіць бар'ер усім заходнім прапаведнікам, якія прабіваюцца ў Беларусь і падрываюць нашы славянскія каштоўнасці". Падчас дэбатаў у ніжняй палаце парламенту, якія адбыліся 26 чэрвеня, па меншай меры адзін дэпутат заявіў, што яўрэі не павінны лічыцца грамадзянамі Беларусі. Іншы прапанаваў стварыць "рэзервацыі" для рэлігійных меншасцяў.

Улады адмаўлялі ў дзяржаўнай рэгістрацыі некаторым рэлігіям, якія лічыліся нетрадыцыйнымі, і ўсім канфесіям, якія былі прызнаны сектамі. Улады сцвярджаюць, што яны адмаўляюць у рэгістрацыі некаторым рэлігійным арганізацыям паколькі "іх дзейнасць супярэчыць Канстытуцыі".

Незалежна ад наяўнасці альбо адсутнасці рэгістрацыі некаторыя рэлігійныя групы сутыкаліся са значнымі цяжкасцямі пры арэндзе альбо набыванні памяшканняў для правядзення рэлігійных службаў, будаўніцтве цэркваў (напрыклад, грэка-каталіцкіх) ці пры адкрытым навучанні царкоўнаслужыцеляў.

Улады па-ранейшаму адмаўлялі рэгістрыраваць БАПЦ, і мясцовыя суды працягвалі адмаўляць БАПЦ у разгляданні апеляцый, якія яна падавала. Прадстаўнікі ўраду сцвярджалі, што айцу Яну Спасюку прадастаўлялася магчымасць атрымаць рэгістрацыю ў Бераставіцкім раёне ў 2001 г., у выпадку, калі б ён прыняў слова "праваслаўная" з назвы царквы. Аднак апошні адмовіўся гэта рабіць. Хаця кіраўніцтва Рускай праваслаўнай царквы не прызнае Яна Спасюка святаром, ён служыць у сане святара, узначальвае прыходы БАПЦ на Беларусі, якія належаць да групы БАПЦ і маюць цесныя сувязі з Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквой. У чэрвені 2002 г. гэта група правяла за межамі краіны "Надзвычайнае пасяджэнне агульнага з'езду БАПЦ", на якой Епіскап Аляксандр быў абраны новым мітрапалітам-прымасам БАПЦ. БАПЦ не мае магчымасці праводзіць навучанне святароў для задавальнення патрэбнасцей яе 70 прыходаў таму, што не здольна зарэгістраваць семінарыю.

З 1992 г. улады адмаўляюцца рэгістраваць індуісцкую групу "Святло Кайласы".

Па інфармацыі дзяржаўных органаў, закон дазваляе выкарыстанне жылога памяшкання для правядзення рэлігійных службаў пасля яго пераабсталявання пад нежылое памяшканне. Жыллёвы кодэкс прыняты ў 1999 г., дазваляе выкарыстанне такіх памяшканняў у якасці нежылых толькі па дазволу мясцовых выканаўчых і адміністрацыйных органаў. У 2000 г. мясцовыя ўлады пачалі ўжываць гэта палажэнне, патрабуючы, каб усе рэлігійныя арганізацыі ажыццявілі перарэгістрацыю сваёй маёмасці. Хаця, па даных дзяржаўных органаў, 110 рэлігійных суполак, уключаючы 34 пратэстанцкіх канфесій, зарэгістравалі сваю маёмасць у адпаведнасці з гэтай працэдурай, адна з пратэстанцкіх груп паведамляла, на працягу

тэрміну рэгістрацыі мясцовыя ўлады адмовілі ў рэгістрацыі 50% пратэстанцкіх груп. Улады працягваюць адмаўляць у рэгістрацыі многім пратэстанцкім цэрквам, такім, як Поўнаевангельская царква пяцідзесятнікаў, а таксама шэрагу нетрадыцыйных канфесій, у выдачы дазволаў на выкарыстоўванне іх маёмасці ў рэлігійных мэтах таму, што гэтыя групы не зарэгістраваны ў якасці рэлігійных груп. Аднак, для таго, каб быць зарэгістраваным у якасці рэлігійнай групы, арганізацыя павінна мець юрыдычны адрас. Рэлігійныя групы, якія не могуць атрымаць рэгістрацыю часта бываюць вымушаны праводзіць свае сходы нелегальна альбо ў дамах, якія належаць членам групы. Частка нетрадыцыйных пратэстанцкіх канфесій нават не спрабавалі зарэгістравацца, бо лічаць, што іх заяўкі не будуць пацверджаны.

На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, многія пратэстанцкія і нетрадыцыйныя групы мелі цяжкасці падчас набыцця маёмасці. КСРН не задаволіў пададзеную ў маі 2002 г. заяўку арганізацыі "Харэ Крышна" аб выдачы дазволу на будаўніцтва цэнтру ў Мінску. Ён таксама не выдаў дазвол зарэгістраванай Евангельскай царкве “Новае жыццё” на будаўніцтва царквы ў Мінску.

Пасля гібелі 53 чалавек, якая была выклікана цісканінай падчас канцэрту на адкрытым паветры ў Мінску ў 1999 г., урад выдаў пастанову, якое вызначае меры па забеспячэнню грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых мерапрыемстваў. Адміністрацыі грамадскіх будынкаў спасылаюцца на гэта пастанаўленне і выкарыстоўваюць яго ў якасці асновы для адмены ці адмовы прадаўжэння дагавораў з рэлігійнымі групамі на выкарыстанне памяшканняў. Нетрадыцыйныя групы, уключаючы Евангельскую царкву “Новае жыццё”, не маглі знайсці памяшканняў у грамадскіх будынках для правядзення службаў з-за адмовы ў іх арэндзе. Хаця каталіцкая царква адкрыла новы касцёл у Мінску ў першай палове 2002 г., яе прадстаўнікі паведамлялі аб цяжкасцях з атрыманнем дазволу на будаўніцтва новых храмаў у Мінску.

Хаця Грэка-каталіцкая царква і мае афіцыйную рэгістрацыю, рэжым Лукашэнка ставіцца да яе адмоўна з-за гістарычна абумоўленых напружаных адносінаў паміж грэка-каталіцкай і Рускай праваслаўнай цэрквамі, а таксама з-за яе адносінаў да выкарыстання беларускай мовы. Як і некаторыя пратэстанцкія дэнамінацыі, шэраг грэка-каталіцкіх кангрэгацый сутыкаўся з цяжкасцямі пры арэндзе памяшканняў для правядзення службаў.

На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, паведамленні аб высяленні рэлігійных груп з займаемых імі памяшканняў не паступалі.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі працягвалі напады на пратэстанцкія групы, у асаблівасці на групы хрысціян-евангелістаў. У студзені 2002 г. дзяржаўная “Народная газета” перадрукавала артыкул, першапачаткова надрукаваны ў мясцовай газеце ў горадзе Старыя Дарогі, у якім сцвярджалася, што смерць дыякана Саюза хрысціян евангельскай веры была актам царкоўнага ахвяравання. У артыкуле гаварылася аб тым, што царква адмовіла маці дыякана, калі апошняя звярнулася з просьбай аб аказанні медыцынскай дапамогі яе сыну, які паміраў ад цыроза пячонкі. Пасля яго смерці маці абвінаваціла царкву ў наўмысным атручэнні яе сына з мэтай ахвяравання. Гэта гісторыя таксама прагучала ў тэлевізійнай праграме “Правы чалавека: погляд на свет”. Вядучы праграмы Яўген Новікаў узяў інтэрвью ў маці дыякана, якая абвінаваціла царкву ў “прынясенні ў ахвяру” яе сына. У маі 2001 г. Саюз хрысціян евангельскай веры падаў на Новікава, Беларускую тэлерадыёкампанію, “Народную газету” і маці дыякана іск аб паклёпе. Іск усё яшчэ знаходзіўся на разглядані ў канцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад. Маці дыякана падала на Саюз хрысціян евангельскай веры і пастара царквы Старыя Дарогі іск аб кампенсаванні маральнага ўрону. Яе справа, якая была спачатку спынена мінскім судом, была адноўлена, але рашэнне па ёй не было вынесена ў канцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад.

У верасні 2002 г. у адным з сюжэтаў тэлевізійнай праграмы “Правы чалавека” нетрадыцыйныя канфесіі былі абвінавачаны ў дэструктыўнасці і

падрыве грамадства. Пасля гэтай перадачы, якая трансліравалася напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, некалькі евангельскіх хрысціянскіх арганізацый паведамлялі аб рэзкім узмацненні праследаванняў і нападзенняў на маёмасць рэлігійных груп. (Гл. Раздзел III).

У артыкуле, які быў апублікаваны ў "Народнай газеце" за 6 красавіка 2002 г. дзяржаўны пракурор Станіслаў Новікаў, які курыруе сферу рэлігійнай дзейнасці ў Дзяржаўнай пракуратуры, пісаў, што распаўсюджванне дзейнасці неправаслаўных груп, у асаблівасці, католікаў і пратэстантаў, на раёны, дзе гэтыя групы раней адсутнічалі, спрыяе павялічэнню напружанасці ў адносінах паміж праваслаўным і неправаслаўным насельніцтвам.

Шэраг артыкулаў, якія былі апублікаваны ў дзяржаўных СМІ ў сакавіку 2002 г., змяшчаў матэрыялы, якія працягвалі напады дзяржаўных чыноўнікаў на пратэстантаў і іншыя "нетрадыцыйныя" канфесіі. У дзяржаўнай газеце "Савецкая Беларусія" быў апублікаваны артыкул пад назвай "Пятля харызмы", у якой сцвярджалі, што евангельскае хрысціянства – атожылак неакультавых плыняў". Пасля атрымання шэрагу скаргаў ад евангелічных хрысціян рэдактар "Савецкай Беларусіі" апублікаваў публічнае выбачэнне. У апублікаваных 13 сакавіка навінах паведамлялася са спасылкай на Маскоўскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльных паслуг у Мінску аб тым, што многія студэнты вышэйшых навучальных установ з'яўляюцца ахвярамі рэлігійных сект. Пры гэтым адзначалася, што найбольш небяспечнымі з іх з'яўляюцца Царква аб'яднання, Сведкі Іегавы і Царква айца Леаніда Плята. У паведамленні гаварылася, што цэнтр аказвае "прафілактычныя паслугі", уключаючы распаўсюджванне інфармацыі аб гэтых групах, псіхалагічную дапамогу і "посткультавую адаптацыю".

У інтэрвью, якое выйшла ў газеце "Сем дзён" 16 сакавіка 2002 г., Аляксандр Цітавец, прадстаўнік Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў, заклікаў да ўвядзення мараторыя на дзейнасць у краіне нетрадыцыйных рэлігій і культаў. 20 сакавіка 2002 г. у інтэрвью агенцтву навін "Інтэрфакс" прадстаўнік Мінскага гарадскога

аддзялення КСРН Валянціна Булавікова назвала дэструктыўнымі Царкву сайенталогіі і Царкву аб’яднання і заявіла, што іх дзейнасць у краіне з’яўляецца незаконнай.

Агенцтва навін “Кестан Ньюз Сэрвіс” паведамляла, што ў апошнім нумары 2001 г. газеты, якая выдаецца мясцовай адміністрацыяй Віцебска, быў апублікаваны артыкул пад назвай “Спыніць каталіцкую экспансію”, у якой змяшчаўся заклік забараніць Рымска-каталіцкую царкву.

У красавіку 2001 г. афіцыйная газета Ўзброеных сіл апублікавала артыкул, у якім змяшчаўся спіс 74 “дэструктыўных сект” уключаючы многія ўсходнія рэлігіі, Царкву Ісуса Хрыста святых апошняга дня (мармонаў) і Сведкаў Іегавы, і рэкамендацыя ваеннаслужачым пазбягаць такіх арганізацый.

Паказаны ў 2000 г. цыкл тэлевізійных дакументальных фільмаў пад назвай “Экспансія” адлюстроўваў пратэстантаў, у асаблівасці пяцідзесятнікаў і католікаў, як дэструктыўныя групы, якія выконваюць фанатычныя абрады і прадстаўляюць пагрозу для грамадства. У сакавіку і красавіку 2001 г. у іншым цыкле фільмаў паказаным па дзяржаўнаму тэлабачанню, пратэстантаў абвінавачвалі ў прынясенні чалавечых ахвяр, атручэнні дзяцей і выкананні іншых “дэструктыўных рытуалаў”. У гэтых фільмах прадстаўнікі КСРН сцвярджалі, што пратэстанцкія групы падрываюць дзяржаўны лад, з’яўляюцца агентамі Захаду і прапаноўвалі забараніць іх дзейнасць у краіне. КСРН і суды адхілілі патрабаванні каталіцкіх і пратэстанцкіх груп спыніць гэтыя перадачы.

Тэарытычна грамадзянам не забараняюць займацца прапаведніцтвам; аднак, хаця людзі могуць свабодна гаварыць аб сваіх рэлігіных вераваннях, улады часта ўмешваюцца, каб прадухіліць ці спыніць дзейнасць альбо пакараць тых, хто займаецца прапаведніцтвам і прадстаўляе незарэгістраваныя канфесіі. Рэжым працягваў ужываць прыняты ў 1999 г. указ Савета Міністраў, які рэгулюе дзейнасць царкоўнаслужыцеляў. Прынятае ў 1997 г. пастанаўленне Савета Міністраў

дазваляе праводзіць рэлігійнае навучанне ў маладзёжных лагерах зарэгістраваных рэлігійных груп.

Урэшце, іншаземцам забаранялася займацца прапаведніцкай дзейнасцю або ўзначальваць цэрквы, якія лічацца нетрадыцыйнымі, уключаючы ўсе пратэстанцкія групы. Іншаземным місіянерам не дазвалялася займацца рэлігійнай дзейнасцю за межамі арганізацый, што іх запрасілі. Закон патрабуе, каб іншаземныя місіянеры мелі шматразовую візу тэрмінам на адзін год з указаннем “духоўнай дзейнасці” ў якасці мэты знаходжання ў краіне. Такія візы бывае цяжка атрымаць нават прадстаўнікам зарэгістраваных уладамі цэркваў, якія існуюць у краіне на працягу доўгага часу. У мінулым, іншаземных святароў або царкоўнаслужыцеляў, якія не рэгістраваліся ў дзяржаўных органах ці якія спрабавалі прапаведаваць без узгаднення з уладамі ці без атрымання запрашэння і дазволу зарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі, высылалі з краіны, аднак, на працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, паведамленняў аб такіх высылках не паступала. Атрыманне дазволу на ўезд іншаземных святароў ці царкоўнаслужыцеляў часта звязана з доўгімі бюракратычнымі працэдурамі. У 2000 г. пастар пратэстанцкай царквы ў Брэсце быў папярэджаны і затым аштрафаваны за тое, што дазволіў іншаземцу выступіць з пропаведдзю на рэлігійнай канферэнцыі. Органы ўнутраных спраў могуць вымусіць святара пакінуць краіну, не прадоўжыць яму рэгістрацыю альбо адмовіць у выдачы дазволу на часовае пражыванне. Гэтыя органы могуць прымаць рашэнні аб высылцы як самастойна, так і на асноаве рэкамендацый Савета па справах рэлігій, рэгіянальных выканаўчых камітэтаў альбо Аддзела па рэлігійных справах Выканаўчага камітэту г. Мінска. На працягу перыяда, які ахоплівае дадзены даклад, паведамленні аб ужыванні гэтай меры не паступалі. Аднак у красавіку 2001 г. на аснаванні гэтых прадпісанняў мінскія гарадскія ўлады адмовілі ў прадаўжэнні рэгістрацыі замежнаму пастару пяцідзесятніцкай Царквы.

Пасля таго, як у 1991 г. пачалося адраджэнне Рымскай каталіцкай царквы, яна стала адчуваць недахоп кваліфікаваных мясцовых святароў. Царква рэгулярна адчувала цяжкасці у атрыманні дазволу на ўезд у краіну, у

асноўным з Польшчы, дастатковай колькасці замежных святароў. Пасля доўгай затрымкі ў 1999 г. рэжым Лукашэнкі даў дазволкаталіцкай царкве адкрыць семінарыю ў Гродна. Другая семінарыя была адкрыта ў Пінску ў верасні 2001 г. Прадстаўнікі рэжыму заявілі, што пасля адкрыцця новых семінарый замежным святарам будзе забаронена працаваць у краіне. Аднак гэта новае прадпісанне не заўсёды выконвалася на мясцовым узроўні, і некаторыя святары ўсё ж атрымлівалі дазвол на работу ў краіне. Епіскапы павінны таксама атрымліваць дазвол КСРН для пераводу замежнага святара ў іншы прыход.

Памеры рэстытуцыі маёмасці заставаліся абмежаванымі на працягу ўсяго перыяду, які ахоплівае дадзены даклад. У гэты час не існуе юрыдычных аснаванняў для рэстытуцыі маёмасці канфіскаванай падчас савецкай і нацысцкай акупацыі, і закон абмяжоўвае рэстытуцыю маёмасці, якая выкарыстоўваецца для культурных і адукацыйных мэтаў. Многія былыя сінагогі ў Мінску выкарыстоўваюцца як тэатры, музеі, спорткомплексы, а ў адной з іх нават размяшчаецца піўны бар, які належыць нямецкай кампаніі. Большасць зваротаў яўрэйскай суполкі з просьбай аб вяртанні сінагог былі адхілены. Вяртанне аб’ектаў маёмасці, якія раней належылі рэлігійным суполкам, насіла разрознены і непаслядоўны характар, і мясцовыя ўлады, як правіла, не жадаюцыісці насустрач. На працягу апошніх некалькіх гадоў яўрэйскай суполцы ўдалося ўпэўніць улады вярнуць ёй некалькі аб’ектаў маёмасці ў Мінску і іншых гарадах. Аднак большая частка маёмасці ўсё яшчэ дагэтуль не вернута. Па даных дзяржаўных органаў у 2001 г. яўрэйскай суполцы былі вернуты тры сінагогі. Аднак адна з яўрэйскіх груп сцвярджае, што толькі адна. Хаця намаганні каталіцкай царквы па вяртанню былой царкоўнай маёмасці былі даволі паспяховымі, каталіцкая царква паведамляла, што ёй не ўдалося дабіцца звароту 21 былога каталіцкага касцёлу. Грэка-каталіцкая царква зазначала, што ёй была вернута толькі адна з многіх цэркваў, канфіскаваных у яе, калі гэты рэгіён быў анексіраваны Расійскай Імперыяй. Па ўсёй бачнасці, Руская праваслаўная царква найбольш паспяхова вырашае пытанне звароту маёмасці. Аднак шэраг іскаў аб рэстытуцыі, паданых Рускай праваслаўнай

царквой, заставаўся незадаволеным у канцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад.

Дзяржаўныя чыноўнікі выканалі шэраг дзеянняў, якія сведчаць аб знявазе да інтарэсаў членаў яўрэйскай суполкі. У студзені 2001 г. яўрэйская суполка абскардзіла рашэнне суда, якое пацвердзіла права апублікавання дзяржаўным выдавецтвам “Праваслаўная ініцыятыва” антысеміцкай кнігі “Вайна па законах подласці”. У ёй поруч з іншымі антысеміцкімі матэрыяламі ўключаны “Пратаколы сіёнскіх мудрацоў”, а на яўрэяў ускладалася адказнасць за існаванне ў краіне сацыяльных і эканамічных праблем. Аднак іх апеляцыя была адхілена. Суддзя, які разглядаў першапачатковую справу, заявіў, што кніга змяшчае “навуковую інфармацыю” і таму не падпадае пад юрысдыкцыю суда. Акрамя таго, у красавіку 2002 г. Сяргей Касьян, які распаўсюджваў кнігу падчас адкрыцця сесіі парламенту ў лістападзе 2002 г., быў назначаны кіраўніком дзяржаўнага выдавецтва, а яго намеснікам быў назначаны Яўген Новікаў. Улады таксама не ажыццявілі якіх-небудзь прыкметных намаганняў па пошуку віноўнікаў падпалу Мінскай сінагогі ў снежні 2001 г. (Гл. Раздзел III).

6 студзеня 2002 г. дзяржаўная радыёкампанія нечакана адмяніла прамую радыётрансляцыю каталіцкай месы з царквы ў Мінску, якая трансліравалася па нядзелях на працягу 8 гадоў. Адміністрацыя радыёкампаніі заявіла, што адмена перадачы была выклікана звычайнымі зменамі ў праграме перадач. Аднак некаторыя назіральнікі звязвалі гэта з іншымі праяўленнямі варожасці ў адносінах да каталіцкай царквы. Пазней прадстаўнікі каталіцкай царквы заявілі, што адмена перадачы адбылася па памылцы. Перадачы аднавіліся напрыканцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад.

Паведамленні аб дыскрымінацыі веруючых у арміі не паступалі. Тыя, хто не жадае служыць у баявых часцях, праходзяць службу ў будаўнічых ці інжэнерных батальёнах. Тэрмін службы ў гэтых падраздзяленнях у два разы перавышае тэрмін службы ў рэгулярнай арміі.

16 мая 2002 г. КСРН накіраваў у Міністэрства інфармацыі скаргу на Беларускую асацыяцыю поўнаевангельскіх хрысціян у сувязі з распаўсюджваннем ёй бюлетэня “Благие новости” ля будынка галоўнай праваслаўнай царквы ў Мінску 5 мая. КСРН спасылаецца на скаргі праваслаўных вернікаў, якія былі зняважаны распаўсюджваннем пратэстанцкай літаратуры поруч з праваслаўнай царквой.

Паведамленняў аб абмежаванасці ўвозу рэлігійнай літаратуры не паступала.

Веруючыя, якія належаць да нетрадыцыйных канфесій, у асаблівасці да тых, рэгістрацыя якіх забаронена, могуць сутыкацца з цяжкасцямі пры прасоўванні па службе ў дзяржаўных установах ці дзяржаўным сектары эканомікі.

**Парушэнні свабоды веравызнання**

На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, міліцыя сарвала правядзенне шэрагу службаў і рэлігійных сходаў, якія праводзіліся мірна ў прыватных дамах групамі, што не здолелі прайсці рэгістрацыю альбо лічыліся нетрадыцыйнымі. Пратэстанцкія, індуісцкія і крышнаіцкія групы паведамлялі аб выпадках зрыву рэлігійных сходаў. Па паведамленню адной з груп евангельскіх хрысціян, міліцыя рэгулярна разганяла малітвенныя сходы і прад’яўляла абвінавачанні супраць вернікаў, якія належаць да незарэгістраваных рэлігійных груп. Напрыклад, у кастрычніку 2001 г. мясцовыя ўлады затрымалі ў Мінску пастара незарэгістраванай пратэстанцкай царквы за правядзенне несанкцыянаванай рэлігійнай службы. Гэта ж царква паведамляла, што з красавіка 2002 г. інцыдэнтаў такога роду больш не адбывалася.

У адрозненні ад папярэдняга справаздачнага перыяду паведамленняў аб затрыманні членаў пратэстанцкіх рэлігійных груп за распаўсюджванне незарэгістраваных рэлігійных матэрыялаў не паступала. Аднак 6 чэрвеня 2002 г. суд аштрафаваў трох баптыстаў прыблізна на 113 долараў ЗША

(200000 рублёў) кожнага за спяванне рэлігійных песняў у грамадскіх месцах у горадзе Лепелі Віцебскай вобласці. Шасці іншым веруючым былі вынесены афіцыйныя папярэджанні, яшчэ двое іншых былі апраўданы. Гэтым баптыстам, што належаць да групы, якая не рэгіструецца ў органах улады ва ўсіх краінах – былых савецкіх рэспубліках, дзе яна зараз дзейнічае, прад'явілі абвінавачанне ва ўдзеле ў несанкцыянаванай дэманстрацыі ў адпаведнасці з палажэннем закону, што звычайна ўжываецца супраць палітычных груп, але іншым разам выкарыстоўваецца і пры разглядзе спраў, якія аднесены да рэлігійнай сферы.

З маю 2002 г. улады ў Гродзенскай вобласці падвяргалі праследаванню рабочых, якія ўзводзілі будынак на участку, што належаў кіраўніку прыхода БАПЦ Яну Спасюку. 10 чэрвеня яны запатрабавалі, каб ён спыніў будаўніцтва нягледзячы на тое, што ў ліпені 2001 г. яму быў выдадзены дазвол на будаўніцтва. Мясцовыя ўлады заявілі, што Спасюк будаваў царкву на участку, які ў адпаведнасці з выдадзеным дазволам павінен быў выкарыстоўвацца для будаўніцтва жылога дома. Напрыканцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, паведамлялася, што ўлады планавалі ануляраваць выдадзены дазвол. У ліпені 2000 г. міліцыя двойчы здзейсніла напад на БАПЦ у вёсцы Пагранічнае, што знаходзіцца недалёка ад Гродна, члены якой праводзілі рэлігійныя службы без рэгістрацыі. Таксама ў ліпені 2000 г. Ян Спасюк быў затрыманы праваахоўнымі органамі па абвінавачанню ў правядзенні несанкцыянаванай службы. Пазней ён быў прыгавораны да пяцідзённага турэмнага зняволення па абвінавачанню ў аказанні супраціўлення пры арышце. 21 мая 2001 г. улады зноў арыштавалі Спасюка, калі ён спрабаваў правесці службу ў вёсцы Радаўляны (Бераставіцкі раён). Затым Спасюк і яго жонка былі выкліканы ў суд, дзе на закрытым пасяджэнні Спасюк, які не меў магчымасці выклікаць сведкаў ці атрымаць юрыдычную дапамогу, быў затрыманы і аштрафаваны за дробнае хуліганства.

4 ліпеня 2001 г. агенцтва "Кестан Ньюз Сэрвіс" паведаміла аб зняцці абвінавачанняў з 20 членаў месіянскай яўрэйскай групы, якія былі затрыманы на некалькі дзён у Мінску ў красавіку і маі за спробу

распаўсюджвання рэлігійнай літаратуры. Таксама былі зняты абвінавачанні спурацьь выдаўніка газеты "Слова", у якую ў якасці дадатку была ўключана рэлігійная літаратура. У маі 2001 г. члены адной з арганізацый спрабавалі расклеіць у цэнтры Мінска лістоўкі, якія змяшчалі віншаванні ветэранам вайны з Днём Перамогі. Падчас расклейкі лістовак, міліцыя па загаду гарадскога аддзела КСРН затрымала на кароткі час членаў групы. Прадстаўнікі КСРН паведамілі групе, што "для ветэранаў будуць зневажальнымі віншаванні, атрыманыя ад яўрэяў". У некаторых членаў групы канфіскавалі частку рэчаў, што ім належала.

Па паведамленнях агенцтва "Кестан Ньюз Сэрвіс", у чэрвені 2001 г Пастар Веніямін Брух, украінскі пастар Царквы Іісуса Хрыста ў Мінску, членамі якой з'яўляюцца каля тысячы вернікаў, быў абвінавачаны ў "ажыццяўленні рэлігійнай дзейнасці без дазволу", да гэтага працаваўшы некалькі гадоў без аніякіх прэтэнзій. Царква Іісуса Хрыста з'яўляецца членам Саюза поўнаевангельскіх цэркваў. Пастару Бруху былі прад'яўлены абвінавачанні ў прысутнасці члена мінскага гарадскога савету і прадстаўніка КСРН, які ў красавіку 2001 г. адмовіў яму ў прадаўжэнні дазволу, як іншаземцу, на ажыццяўленне рэлігійнай дзейнасці. Пазней ён пакінуў краіну.

**Прымусовае схіленне да веры**

Паведамленняў аб выпадках прымусовага схілення да веры, у тым ліку непаўналетніх грамадзян ЗША, якіх выкралі ці незаконна вывезлі з ЗША, альбо аб адмаўленнях такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты, не паступала.

**Раздзел III. Адносіны грамадскасці**

У асноўным адносіны паміж традыцыйнымі рэлігійнымі суполкамі носяць міралюбівы характар. Аднак на працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, на бытавым узроўні захоўваўся антысемітызм і працягвалі ўзмацняцца крытычныя адносіны да рэлігійных меншасцяў.

Мелі месца выпадкі вандалізму, якія, па ўсёй бачнасці, з’яўляюцца праяўленнем бытавога антысемітызму. У студзені 2002 г. у Брэсце быў арыштаваны 17-гадовы падлетак, які апаганіў помнік ахвярам генацыду. Ён утрымліваўся ў зняволенні каля месяца, пасля чаго быў вызвалены і пазней не з’явіўся на суд. Мясцовыя ўлады не настойвалі на працягу разбіральніцтва. У сакавіку 2001 г. невядомыя вандалы знішчылі пяць помнікаў на яўрэйскіх могілках у Віцебску. У снежні 2001 г. неўстаноўленыя злачынцы кінулі пяць бутэлек з запальваючай сумессю ў будынак сінагогі ў Мінску. Вартаўнік здолеў патушыць полымя да таго, як будынку быў учынены ўрон. Напрыканцы перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, паведамленняў аб станоўчых выніках расследавання не паступала.

Па даных Лігі супраць дыфамацыі і Сусветнага яўрэйскага кангрэсу на перыферыі грамадства існуе шэраг ультранацыяналістычных арганізацый, і шэраг газет рэгулярна публікуе антысеміцкія матэрыялы. Па наяўнай інфармацыі, адно з такіх выданняў – “Славянская газета” – якая распаўсюджваецца ў краіне, друкуецца ў Маскве. Таксама шырока распаўсюджваюцца антысеміцкія матэрыялы, якія паступаюць з Расіі.

Многія члены яўрэйскай суполкі занепакоены тым, што рэалізацыя планаў рэжыму Лукашэнкі па ўзмацненню саюза з Расіяй можа суправаджацца палітычнымі зваротамі да тых груп у Расіі, якія цярпіма ставяцца да антысемітызму альбо падтрымліваюць яго. Заклікі Лукашэнкі да “славянскай салідарнасці” былі станоўча ўспрыняты і падтрыманы антысеміцкімі і неафашысцкімі арганізацыямі ў Расіі. Напрыклад, Рускі нацыянальны саюз (неафашысцкая арганізацыя, якая выступае супраць іншаземцаў і рэлігійных меншасцяў) мае ў краіне мясцовае аддзяленне, а яе літаратура распаўсюджваецца ў гармадскіх месцах у Мінску. Ідэя “шырокага славянскага саюзу” выклікае занепакоенасць яўрэйскай суполкі ў свеце характару той падтрымкі, якую яна нараджае.

На працягу некалькіх месяцаў перад прэзідэнцкімі выбарамі, якія адбыліся ў верасні 2001 г., шэраг пратэстанцкіх груп паведамляў аб узмацненні праследаванняў, уключаючы апаганьванне цэркваў у многіх рэгіёнах

краіны. Па паведамленню адной евангельскай хрысціянскай групы, у выніку падпалаў былі знішчаны па меншай меры тры евангельскіх царквы. Многія пратэстанцкія і евангельскія хрысціянскія групы паведамлялі аб прадаўжэнні праследаванняў, хаця і ў значна меншай ступені, і пасля прэзідэнцкіх выбараў. У студзені 2002 г. адна евангельская хрысціянская група паведаміла, што вандалы напалі на вартаўніка адной з яе цэркваў і звязалі яго. Па словах сведкі, яны намалявалі пентаграмы на сценах царквы, а ў самой царкве была знойдзена “прынесеная ў ахвяру” мёртвая котка. Адна з баптысцкіх арганізацый паведамляла, што невядомыя пабілі шкло ў вокнах некалькіх баптысцкіх цэркваў.

Невялікая мусульманская суполка, якая існуе ў краіне і чые карані зыходзяць у сярэднія стагоддзі, не паведамляла аб якіх-небудзь выпадках прадузятых адносінаў. На працягу перыяду, які ахоплівае дадзены даклад, ад яе не паступалі паведамленні аб якіх-небудзь праяўленнях вандалізму ў адносінах да яе.

Не маецца прыкметаў таго, што Руская праваслаўная царква змяніла свой намер ажыццяўляць супрацоўніцтва толькі з рэлігійнымі канфесіямі, якія маюць ў краіне гістарычныя карані. У сваім звароце да Усебеларускага народнага кангрэсу Мінскі Патрыяршы Экзарх Філарэт заклікаў улады да супрацоўніцтва з Рускай праваслаўнай царквой з тым, каб абараніць “духоўную бяспеку” народу і абмежаваць прысутнасць “дэструктыўных і псеўдахрысціянскіх суполак, якія падрываюць духоўнае, сацыяльнае і культурнае адзінства народу”. Нягледзячы на заявы прадстаўнікоў рэжыму і рускай праваслаўнай царквы аб тым, што яўрэйскія мусульманскія і каталіцкія групы падтрымліваюць праект закону аб рэлігіі, многія кіраўнікі рэлігійных арганізацый, якія не належаць да рускай праваслаўнай царквы, уключаючы кіраўнікоў яўрэйскай і рымска-каталіцкай цэркваў, альбо падверглі крытыцы гэты праект закону, альбо выступілі супраць яго.

Большасць мясцовых неўрадавых арганізацый не выдзяляе значных рэсурсаў на рашэнне праблем, якія існуюць у вобласці забеспячэння свабоды веравызнання.

**Раздзел IV. Палітыка ўрада**

Урад ЗША паднімаў пытанні выканання свабоды веравызнання ў кантэксце неаднаразовых абмеркаванняў нездавальняючай сітуацыі з правамі чалавека ў краіне. У чэрвені 2002 г. Пасольства зрабіла публічнае заяўленне, у якім заклікала ўлады прыняць неабходныя меры з тым, каб прапанаваны праект закону аб рэлігіі гарантаваў усім грамадзянам свабоду веравызнання. Прадстаўнікі пасольства таксама абмяркоўвалі пытанні выканання свабоды веравызнання з прадстаўнікамі зарэгістраваных і незарэгістраваных рэлігійных груп. Пасольства працавала сумесна з Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, а таксама пасольствамі шэрагу іншых краін з мэтай забеспячэння выканання свабоды веравызнання ў краіне.

Прадстаўнікі Дзяржаўнага дэпартаменту ЗША правялі шэраг сустрэч у Вашынгтоне з прадстаўнікамі Ураду Беларусі з мэтай садзейнічання выкананню свабоды веравызнання і вырашэння іншых праблем, звязаных з выкананнем правоў чалавека.

Выдадзены 7 кастрычніка 2002 г.